Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 10 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 150 (4694) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня адкрываецца Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў

Адкрыцьцё 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ўдарнікаў адбудзецца сёньня, 10 ліпэня 1933 г., а 12 гадзіне дня ў летнім тэатры саду „Прафінтэрн“.

Уваход у сад „Прафінтэрн“—па дэлегацкіх мандатах, службовых і гасьцявых білетах

Члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены СНК і прэзыдыуму ЦВК, члены бюро ЦК ЛКСМБ прахо-дзяць па сваіх мандатах.

АРГКАМІСІЯ

АБ ПЕРАБУДОВЕ ОРГАНАЎ КІРАЎНІЦТВА ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць зацьвердзіць наступныя рашэньні Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін аб перабудове і штатах органаў кіраўніцтва чыгуначнага транспарту, якія прыняты на аснове пастановы СНК і ЦК ад 3 ліпеня «Аб рабоце чыгуначнага транспарту»:

I. ПА АПАРАЦЕ НКШЗ

1. Скасаваць наступныя зараз існуючыя ў НКШЗ кіраўніцтвы і трэсты:

а) кіраўніцтва працы, перадаўшы пытаньні працы адпаведным кіраўніцтвам і аддзелам;

б) кіраўніцтва тэхпрапаганды, перадаўшы гэтыя функцыі аддзелу падрыхтоўкі кадраў і «транчыгунвыдату»;

в) камітэт па рэканструкцыі транспарту, перадаўшы функцыі яго плянава-эканамічнаму аддзелу і нарадзе пры наркоме;

г) кіраўніцтва транспартнага машынабудаўніцтва і запасных частак, перадаўшы функцыі па заказах рухомага складу і запасных частак кіраўніцтву паравозных гаспадаркі і кіраўніцтву вагоннай гаспадаркі;

д) кантору па праектаваньні мэханізмаў і машын («Проектмэхмаш»);

е) камунальнае кіраўніцтва, перадаўшы яго функцыі кіраўніцтву шляху;

ж) навукова-тэхнічнае кіраўніцтва, перадаўшы яго функцыі кіраўніцтвам і аддзелам;

з) Цэнтральнае кіраўніцтва разьмеркаваньня, перадаўшы яго функцыі адпаведным кіраўніцтвам і аддзелам;

і) кіраўніцтва рэканструкцыі Маскоўскага вузла, перадаўшы функцыі гэтага кіраўніцтва ў кіраўніцтва эксплёатацыі;

к) гіпразаводтранс з ператварэньнем яго ў праектную кантору пры паравоза-ремонтным трэсьце;

л) трэст тэхніка-эканамічных дасьледаваньняў, перадаўшы яго функцыі адпаведным кіраўніцтвам і аддзелам;

і) кіраўніцтва рэканструкцыі Маскоўскага вузла, перадаўшы функцыі гэтага кіраўніцтва ў кіраўніцтва эксплёатацыі;

к) гіпразаводтранс з ператварэньнем яго ў праектную кантору пры паравоза-ремонтным трэсьце;

л) трэст тэхніка-эканамічных дасьледаваньняў, перадаўшы яго функцыі кіраўніцтву новага чыгуначнага будаўніцтва;

м) кіраўніцтва кантролю, праверкі выкананьня, арганізаваўшы пры наркоме групу кантролю праверкі выкананьня;

н) навукова-дасьледчы Інстытут працы і эксперыментальна-канструктарскі Інстытут, перадаўшы функцыі гэтых Інстытутаў у інстытуты пры кіраўніцтвах і аддзелах.

2. Устанавіць наступную структуру асноўных цэнтральных кіраўніцтваў і аддзелаў НКШЗ:

а) паліткіраўніцтва;

б) кіраўніцтва эксплёатацыі;

в) кіраўніцтва паравозных гаспадаркі;

г) кіраўніцтва вагоннай гаспадаркі;

д) кіраўніцтва шляху і пабудаваньняў;

е) кіраўніцтва сыгналізацыі і сувязі;

ж) кіраўніцтва новага чыгуначнага будаўніцтва.

3. Разарганізаваць наступныя кіраўніцтвы і трэсты ў цэнтральныя аддзелы:

а) плянава-эканамічны;

б) фінансавы;

в) матар'яльнага снабжэньня;

г) электрафікацыі;

д) пясной гаспадаркі;

е) падрыхтоўкі кадраў;

ж) галоўная інспэкцыя пры Наркоме;

з) уліку;

і) мабілізацыйны;

к) санітарна-мэдычны;

л) аховы шляхоў зносін;

м) тылавога апалчэньня;

н) бюро па міжнародных зносінах;

о) адміністрацыйна-арганізатарскі;

п) кіраўніцтва справамі;

р) камітэт стандартызацыі;

с) тарыфны камітэт;

т) арбітраж;

Арганізаваць у НКШЗ аддзел па рабочаму снабжэньню.

4. Захаваць і разарганізаваць наступныя трэсты:

а) паравоза-рамонтных заводаў з падначаленьнем кіраўніцтву паравозной гаспадаркі;

б) вагона-рамонтных заводаў з падначаленьнем кіраўніцтву вагоннай гаспадаркі;

в) трэст машынабудаўніцтва;

г) транчыгунавыдат, аб'яднаны з трансдрукам.

У спасаваньне існуючага парадку аб назначэньні ўстанавіць, што нарком непасрэдна назначае і звальняе: начальнікаў кіраўніцтваў і аддзелаў і іх намесьнікаў — па НКШЗ; начальнікаў дарог і іх намесьнікаў, начальнікаў служб дарогі: эксплёатацыі, паравозаў, вагонаў, шляху, сувязі, а таксама начальнікаў раёнаў, дырэктароў трэстаў і заводаў.

Замест існуючага агульнага штату па НКШЗ (з інстытутамі) у колькасьці 5.631 чалавек устанавіць агульны штат цэнтральнага апарату НКШЗ з інстытутамі ў 4.262 чал., без інстытутаў — 3.291.

II. КІРАЎНІЦТВА ДАРОГІ

1. Асноўнай гаспадарчай адзінкай чыгуначнага транспарту вызначаецца дарога. Начальнік дарогі поўнасьцю адказвае за становішча ўсёй гаспадаркі і работу данай дарогі і падначальваецца непасрэдна наркому.

У адпаведнасьці з гэтым спыніць існуючую ў некаторых кіраўніцтвах НКШЗ практыку кіраваць паасобнымі лінейнымі арганізацыямі дарогі праз галаву начальніка дарогі.

2. Вяжнейшай задачай начальніка дарогі зьяўляецца ліквідацыя канцылярска-бюракратычных мэтадаў у рабоце служб і аддзелаў дарогі і ажыцьцяўленьне канкрэтнага жывога кіраўніцтва лініяй; устанаўленьне цьвёрдай працоўнай дысцыпліны ў органах кіраўніцтва і ў вытворчасьці, пунктуальнае выкананьне ўказаньняў і распараджэньняў НКШЗ, выкананьне ўстаноўленага НКШЗ трансфінпляну дарогі.

3. Дарога працуе на аснове гаспадарчага разьліку. Сродкі, якія адпускаюцца НКШЗ дарозе як па эксплёатацыі, так і на капітальнае будаўніцтва, знаходзяцца ў поўным распараджэньні начальніка дарогі і расходуюцца па ўстаноўленаму НКШЗ пляну. Кіраўніцтвы НКШЗ ня могуць гэтыя сродкі і матар'ялы перараз ьмяркоўваць бяз згоды начальніка дарогі ці без спэцыяльнага распараджэньня наркома. У пляне фінансаваньня дарог павінен быць пакінуты некаторы фонд на непрадугледжаныя патрэбы дарогі, які знаходзіцца ў распараджэньні начальніка дарогі.

4. Начальніку дарогі непасрэдна падначалены раёны, асноўныя дэпо і вучасткі вагоннай гаспадаркі, майстэрні, дыстанцыі шляху, дыстанцыі сувязі.

5. Начальник дарогі прадстаўляе да назначэньня наркому начальнікаў служб і начальнікаў раёнаў. Начальнік дарогі непасрэдна назначае начальнікаў аддзелаў дарогі, намесьнікаў начальнікаў служб і аддзелаў, інспэктароў раёну, начальнікаў асноўных паравозных дэпо, начальнікаў майстэрань вагоннай гаспадаркі, начальнікаў дыстанцыі шляху, дыстанцыі сувязі па прадстаўленьні начальнікаў служб дарогі.

6. Для ажыцьцяўленьня штодзённага кантролю праверкі выкананьня важнейшых распараджэньняў на дарозе, начальнік дарогі мае пры сабе штат інспэктароў ад 3 да 5 чалавек.

7. Скасаваць зараз існуючыя пры дырэкцыях дарог пасады і аддзелы:

а) камунальны; б) камэрцыйны; в) працы; г) уліку і разьмеркаваньня кадраў; д) рацыяналізацыі; е) сакрэтна-шыфравальны; ж) бясьпечнасьці і рух; з) тэхнічнай прапаганды; і) дапаможных прадпрыемстваў.

Функцыі скасаваных аддзелаў перадаць у адпаведныя службы і пакінутыя пры новай структуры аддзелы.

8. Устанавіць наступную тыповую структуру для дарог:

а) начальнік дарогі;

б) намесьнік начальніка дарогі;

в) начальнік паліткаддзелу дарогі;

г) памочнік па рабочым снабжэньні (нач. ОРС'а);

д) арганізаваць пры кіраўніцтве начальніка дарогі наступныя службы: эксплёатацыі, паравозаў, вагонаў, шляху і пабудаваньняў сыгналізацыі і сувязі.

Распараджэньні начальнікаў служб для лінейных адміністрацыйна-гаспадарчых зьвеньняў зьяўляюцца абавязковымі да дакладнага выкананьня.

9. Арганізаваць пры кіраўніцтве начальніка дарогі наступныя аддзелы:

а) паліткаддзел;

б) плянавы аддзел;

в) фінансавы аддзел і асобна бухгальтэрыю;

г) матар'яльны;

д) рабочага снабжэньня;

е) будаўнічы ці будаўнічую кантору на дарогах (якія маюць вялікі аб'ём будаўнічых работ);

ж) электрычны (там, дзе ёсьць электрыфікаваныя вучасткі);

з) пясны (на дарогах, якія займаюцца пясными распрацоўкамі);

і) падрыхтоўкі кадраў;

к) санітарна-мэдычны;

л) уліку і справаздачнасьці;

м) мабілізацыйны;

н) аховы чыгунак;

о) адміністрацыйна-арганізацыйны.

Замест зараз існуючых штатаў у колькасьці 25.182 устанавіць агульны штат для ўсіх дырэкцый дарог у 23.844 (без паліткаддзелаў і ОРС'аў).

III. КІРАЎНІЦТВА РАЁНУ

1. Начальнік раёну непасрэдна кіруе эксплёатацыйнай работай, забясьпечвае нармальны рух цягнікоў і бясьпечнасьць руху і дакладнае выкананьне ўсімі агентамі правіл тэхнічнай эксплёатацыі; устанаўляе належную працоўную дысцыпліну і парадак на ўсіх станцыях і цягніках, устанаўляе вымяральнікі работы вагонаў, нясе за даручаную яму работу поўную адказнасьць.

2. Начальнік раёну падначалены непасрэдна начальніку дарогі, а ў адносінах выкананьня апэрацыйных распараджэньняў па эксплёатацыйнай рабоце падначальваецца начальніку службы руху дарогі; начальнік раёну назначаецца з ліку вопытных арганізатараў-адміністратараў, якія маюць належныя веды ў галіне эксплёатацыі.

4. Начальніку раёну падначалены непасрэдна ў межах граніц раёну ўсе станцыі і разьезды.

5. Начальнік раёну сочыць за дакладным і своячасовым выкананьнем усіх распараджэньняў начальніка дарогі і начальнікаў служб, за асноўнымі дэпо, вагоннымі вучасткамі, дыстанцыямі шляху і сувязі, кантралюе іх работу з пункту погляду забесьпячэньня ўсіх неабходных умоў для дакладнага выкананьня графіка руху цягнікоў, своячасовай падачы паравозаў і вагонаў, тэхнічнага агляду і рамонту паравозаў і вагонаў, спраўнага становішча шляху і сродкаў сувязі. У выпадку невыкананьня распараджэньняў начальніка дарогі, незабесьпячэньня ўмоў для нармальнага руху цягнікоў з боку кіруючага пэрсаналу паравознага, вагоннага вучастку дэпо, дыстанцыі, шляху і сувязі, начальнік раёну, апрача неадкладнага паведамленьня аб гэтым начальніку дарогі ці начальніку адпаведнай службы, можа сам налажыць на вінаватых адміністрацыйнае спагнаньне ў межах тых правоў, якія яму прадастаўляе статут аб дысцыпліне на чыгуначным транспарце.

Начальнік раёну поўнасьцю распараджаецца ў межах пляну вызначанымі для раёну сродкамі, усімі фінансава-матар'яльнымі сродкамі па эксплёатацыйным раёне.

6. Начальнік раёну прадстаўляе на зацьверджаньне начальніка дарогі начальнікаў па-заклясных і першай клясы станцый і інспэктароў раёну. Начальнік раёну непасрэдна назначае намесьнікаў начальнікаў па-заклясных і першай клясы станцый, усіх начальнікаў і іх намесьнікаў астатніх клясаў станцый і разьезду.

7. У адпаведнасьці з узмацненьнем ролі начальніка дарогі ў адносінах лінейных арганізацый — асноўнага дэпо, вагоннага вучастку, дыстанцыі шляху і сувязі — і абмежаваньнем функцый раёнаў выключна работай па руху цягнікоў (эксплёатацыі), разарганізаваць раёны, скасаваўшы наступныя зараз існуючыя ў раёнах аддзелы:

а) аддзел цягі;

б) аддзел шляху;

в) аддзел сувязі;

г) камунальны аддзел;

д) уліку і разьмеркаваньня;

е) аддзел працы;

ж) бюро бясьпечнасьці руху.

8. Устанавіць наступную структуру раёну:

а) начальнік раёну, ён-жа начальнік эксплёатацыі;

б) начальнік паліткаддзелу раёну;

в) два памочнікі начальніка раёну (адзін тэхнічны, другі — па камэрцыйнай рабоце);

г) інспэктары: па паравозах, вагонах, шляху, сувязі і рабочым снабжэньні па 1-3 для кожнай галіны ў залежнасьці ад велічыні раёну;

д) кантора раёну ў частцы: грузавая, пасажырская, камэрцыйная, рахункова-фінансавая, мабілізацыйная, тахбюро, загадчык кандуктарскіх брыгадамі;

е) агульны штат па раёне (без дыспэтчарскага апарату і штату паліткаддзелу) не павінен перавышаць для раёну першай катэгорыі 86, другой — 76 і трэцяй 62.

***

Замест існуючых агульных штатаў па раёнах у колькасьці 1.736, устанавіць агульны штат у раёнах у 8.840 (бяз дыспэтчароў, паліткаддзелаў і ОРС'аў).

IV КІРАЎНІЦТВА АСНОЎНАГА ПАРАВОЗНАГА ДЭПО

1. Скасаваць наступныя, зараз існуючыя ў дэпо, пасады і бюро:

а) памочнікаў начальнікаў дэпо па тэхнічнай частцы;

б) памочнікаў начальнікаў бюро па масавай рабоце (па вытворчых нарадах і рабочых прапановах), перадаўшы іх функцыі начальніку дэпо і старшыні мясцкому;

в) памочніка начальніка дэпо па снабжэньню;

г) інжынэра для тэхнічных заняткаў, інжынэра бюро знаёмікі і працы, інжынэра па тэхнармаваньні, інструктара па тэхпрапагандзе, перадаўшы работу ў тэхнічнае бюро пры начальніку дэпо;

д) інструктара па прыёмцы паравозаў;

е) скараціць колькасьць машыністаў-настаўнікаў на 50 проц. перавесьці іх на паязную работу ў якасьці машыністаў.

2. Устанавіць наступную тыповую структуру для асноўнага дэпо:

а) начальнік дэпо;

б) намесьнік начальніка дэпо (інжынэр);

в) арганізаваць пры начальніку дэпо тэхнічнае бюро ў складзе 3-5 інжынэраў і тэхнікаў для распрацоўкі тэхнічных пытаньняў;

г) устанавіць пасады майстроў па паравозным рамонце, па спэцыяльных відах рамонту (нацельнага па пад'ёмцы і інш.) замест цяперашняга аднаго майстра. Пасады мэнцёраў у дэпо скасаваць і замест іх увесьці пасады брыгадзіраў, падначаленых непасрэдна майстру. Мэнцёраў перавесьці ў брыгадзіры і майстры ў залежнасьці ад іх кваліфікацыі;

д) начальніку асноўнага дэпо падначаліць у межах абслугоўваемага цягавага вучастку абаротных дэпо і вадазабжэньне, цёплатэхніку — электрычныя станцыі;

е) начальнікі асноўных дэпо назначаюцца пераважна з інжынэраў і тэхнікаў-практыкаў, якія даволі ўладаюць тэхнічнымі ведамі ў галіне паравозной і вагоннай гаспадаркі, якія маюць адміністрацыйна-арганізацыйны стаж.

V. КІРАЎНІЦТВА ВУЧАСТКУ ВАГОННАЙ ГАСПАДАРКІ

1. Выпучыць усе вагонныя дэпо з веданьня паравозных дэпо і арганізаваць самастойныя вучасткі па вагоннай гаспадарцы, падначаленьні непасрэдна вагоннай службе кіраўніцтва дарогі.

2. Устанавіць наступную структуру для вучастку:

а) начальнік вагоннага вучастку, ён-жа начальнік вагоннага дэпо;

б) намесьнік інжынэра ці вопытны тэхнік па вагонах;

в) тэхнічнае бюро (3-5 чал.);

г) вагонныя майстры (пасажырскія і таварныя для пасосных відаў рамонту);

д) брыгадзіры (па спэцыяльнасьцях);

е) начальнік цягніковых брыгад (праваднікоў і змазчыкаў).

VI. КІРАЎНІЦТВА СТАНЦЫІ

1. Скасаваць наступныя зараз існуючыя на станцыях першай клясы пасады і бюро:

а) намесьніка начальніка станцыі па масавай рабоце (вытворчых нарадах і рабочых прапановах), перадаўшы гэту работу начальніку станцыі і старшыні мясцкому;

б) старшых памочнікаў начальніка станцыі;

в) бюро эканомікі працы усклаўшы работу па ўстанаўленьні норм расцэнак на начальніка станцыі;

г) бюро вынаходзтва, усклаўшы гэту работу на начальніка станцыі і яго намесьнікаў па спэцыяльнасьцях;

д) бюро маршрутызацыі, усклаўшы гэту работу на намесьніка начальніка станцыі па тэхнічнай частцы і зьмен ных дзяжурных станцый;

е) упаўнаважаных па тэхпраме;

ж) бухгальтэрыю, пераводзячы станцыю на цьвёрды каштарыс.

2. Устанавіць наступную тыповую структуру для станцый першай клясы:

а) начальнік станцыі;

б) два намесьнікі начальніка станцыі, з якіх адзін па тэхнічнай частцы (інжынэр ці тэхнік з вытворчым стажам), другі па камэрцыйнай частцы;

в) станцыйныя дыспэтчары — па адным у зьмену;

г) дзяжурныя па станцыі, па асобных парках;

д) саставіцелі цягнікоў па асобных парках;

е) загадчык таварнай канторы;

ж) наглядчык таварнага двара;

з) вагаўшчыкі па колькасьці і аб'ёму грузавых апэрацый;

і) адзін-два інжынэры або тэхнікі пры нач. станцыі для распрацоўкі тэхнічных пытаньняў;

к) кантора пры начальніку станцыі;

Прапанаваць НКШЗ у адпаведнасьці са структурай станцый першай клясы ўстанавіць структуру ўсіх астатніх станцый сеткі чыгунак.

VII. КІРАЎНІЦТВА ДЫСТАНЦЫІ ШЛЯХУ

1. Скасаваць наступныя зараз існуючыя на дыстанцыях шляху пасады і бюро:

а) намесьніка начальніка дыстанцыі;

б) памочніка начальніка дыстанцыі па масавай рабоце;

в) бюро эканомікі працы, усклаўшы работу па ўстанаўленьні норм расцэнак на начальніка дыстанцыі і дарожных майстроў. Начальніку дыстанцыі для работы па нармаваньні дазваляецца мець аднаго тэхнічнага работніка;

г) бюро вынаходзтва, усклаўшы яго работу на начальніка дыстанцыі і дарожных майстроў на сваіх вучастках работы;

д) бюро па тэхнічнай прапагандзе, перадаўшы работу па тэхнічнай падрыхтоўцы работнікаў дыстанцыі начальніку дыстанцыі і дарожным майстрам.

2. Устанавіць наступную тыповую структуру для дыстанцыі шляху:

а) начальнік дыстанцыі;

б) старшы дарожны майстар;

в) даглядчык будынкаў (ён-жа пам. нач. дыстанцыі па грамадзянскіх пабудаваньнях);

г) дарожныя майстры па даўжыні дыстанцыі;

д) памочнікі дарожных майстроў;

е) брыгадзіры па шляху;

ж) мастовы майстар.

На буйных чыгуначных вузлох арганізаваць спэцыяльныя жыльлёвыя дыстанцыі з падначаленьнем іх непасрэдна начальніку службы шляху і дарогі.

Начальнікі дыстанцыі шляху павінны назначацца пераважна з інжынэраў будаўніча-шляхавай спэцыяльнасьці, якія маюць практыку шляхава-будаўнічых работ і маюць адміністрацыйна-арганізатарскія здольнасьці.

VIII. КІРАЎНІЦТВА ДЫСТАНЦЫІ СЫГНАЛІЗАЦЫІ І СУВЯЗІ

1. Скасаваць наступныя зараз існуючыя па дыстанцыі сыгналізацыі і сувязі пасады і бюро:

а) памочніка начальніка дыстанцыі сыгналізацыі і сувязі па масавай рабоце;

б) інструктара па тэхпрапагандзе, перадаўшы работу па тэхнічнай падрыхтоўцы работнікаў дыстанцыі сыгналізацыі і сувязі нач. дыстанцыі і тэхнічнаму пэрсаналу па спэцыяльнасьці (па сыгналізацыі, цэнтралізацыі і блёкіроўцы па сувязі).

2. Устанавіць наступную тыповую структуру для дыстанцыі сыгналізацыі і сувязі:

а) начальнік дыстанцыі;

б) пам. начальніка дыстанцыі (інжынэр па сыгналізацыі, цэнтралізацыі і блёкіроўцы);

в) рэвізор-інструктар;

г) інжынэр ці тэхнік сувязі.

Начальнікі дыстанцыі сыгналізацыі і сувязі назначаюцца пераважна з інжынэраў ці практыкаў, якія даволі ўладаюць тэхнічнымі ведамі ў галіне сыгналізацыі і сувязі і маюць адміністрацыйна-арганізацыйны вопыт.

IX. АБ НАЧАЛЬНІКУ ДЭПО, ВАГОННАГА ВУЧАСТКУ, СТАНЦЫІ, ДЫСТАНЦЫІ

1. Начальнік дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі зьяўляецца адзіналічным, поўнапраўным кіраўніком работ і непасрэдна адказвае за выкананьне пляну па ўсіх паказальніках; ажыцьцяўляе спэцыяльнае кіраўніцтва ўсімі работамі па дэпо, вагонным вучастку, станцыях, дыстанцыях і наглядае за спраўнасьцю тэхнічных пабудаваньняў дэпо, станцыі, дыстанцыі і іх правільным скарыстаньнем.

2. Начальніку дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі падначальваюцца адпаведна ўсе як пастаянныя, так і часовыя агенты і рабочыя.

3. Начальнік дэпо вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі робіць прыём і звальненьне ўсіх работнікаў, за выключэньнем наступных: па дэпо — намесьніка нач. дэпо, нач. абаротных дэпо і майстроў дэпо; па вагонным вучастку — нам. начальніка, вагонных майстроў; па станцыі — нам. начальніка станцыі, станцыйных дыспэтчараў, дзяжурных па станцыі і загадчыка таварнай канторы; па дыстанцыі шляху — старшых дарожных майстроў і мастовога майстра; па дыстанцыі сувязі — памочніка начальніка станцыі (інжынэр, СЦБ, рэвізора-інструктара і інжынэра сувязі. Пералічаных вышэй работнікаў назначаюць і звальняюць начальнікі служб дарогі па прадстаўленьні начальнікаў дэпо, станцыі і дыстанцыі.

4. Начальнік дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі ўстанаўляе нормы і расцэнкі работы, устанаўляе премі агентам і рабочым дэпо, станцыі, дыстанцыі ў межах фондаў, згодна ўказаньняў начальніка дарогі.

Перамяшчаньне інжынэрна-тэхнічных работнікаў рабіць не ў парадку агульнай кампаніі, а шляхам старанна пэрсанальнага адбору кваліфікаваных работнікаў з забесьпячэньнем іх нармальнымі жыльлёва-бытавымі ўмовамі на месцы.

3. НКШЗ і ЦУНХУ у 3-месячны тэрмін перагледзець усе формы справаздачнасьці, рашучэй іх скараціўшы, пакінуўшы толькі абсалютна неабходную для работы дарог статыстычную апэратыўную справаздачнасьць.

4. Ускласьці на народнага камісара шляхоў зносін і паліткіраўніцтва НКШЗ, а па дарогах — на начальнікаў дарог і паліткаддзелаў адказнасьць за своячасовае і пунктуальнае правядзеньне ў жыцьцё даней пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) І. СТАЛІН.

8 ліпеня 1933 г.

АБ ПЕРАБУДОВЕ СЫСТЭМЫ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ І НАРМАВАНЬНЯ ПРАЦЫ НА ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць зацьвердзіць наступныя рашэньні Народнага камісарыяту шляхоў зносін аб перабудове сыстэмы заработнай платы і нармаваньня працы на чыгуначным транспарце, прынятыя на аснове пастановы Саўнаркому Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) ад 3-га ліпеня «Аб рабоце чыгуначнага транспарту».

Па паляпшэньні сыстэмы зарплаты і нармаваньня працы

1. Ліквідаваць даведзеную да крайнасьці шматпікасьць і дробнасьць норм выпрацоўкі і расцэнак, для чаго распрацаваць і ўвесьці невялікую колькасьць тыповых нормаў па ўзбуйненых вымяральніках рамонту паравозаў і вагонаў, па службах шляху, сувязі да першага лістапада, а па службе эксплёатацыі — да першага жніўня 1933 г., скасаваўшы да гэтага часу раней выданыя нармовачнікі па асобных дарогах і службах.

2. Ліквідаваць існуючыя тарыфна-нармовачныя бюро, усклаўшы непасрэднае кіраўніцтва і адказнасьць за тэхнічнае нармаваньне на адпаведных гаспадарчых кіраўніцтвах.

Нормы выпрацоўкі ўстанаўляць у адпаведнасьці з тыповымі нормамі і тарыфнаю згодаю для службах паравозаў і вагонаў — цэхавым майстрам, па службе шляху — дарожным майстрам, па службе сувязі — электрамэханікам, па службе руху — начальнікам станцыі і адпаведна зацьвярджаць начальнікам дэпо, вагонных вучастках, дыстанцый шляху і сувязі, раёнаў.

Для ажыцьцяўленьня кантролю за правільнасьцю ўстанаўленьня і дапасаваньня норм расцэнак начальнікам дэпо, станцый. Дыспэтчару раёнаў мець у сваім распараджэньні аднаго-двух кантрольных нармоўшчыкаў-тарыфнікаў.

3. Прадаставіць права майстром цэхаў, начальнікам дэпо і вагонных вучастках, станцый, дыстанцый у залежнасьці ад канкрэтных умоў у межах зацьверджаных фондаў зарплаты і заданьняў па кошту, павышаць і паніжаць зацьверджаныя нормы выпрацоўкі да 10 проц., а таксама ўстанаўляць нормы выпрацоўкі, расцэнкі на разавыя работы, не прадугледжаныя тыповымі і зацьверджанымі нормамі.

4. Для саставіцельскіх брыгад па кожнай станцыі ўстанавіць ня больш 5-6 норм расцэнак, прадаставіўшы права дзяжурным па шляхох у залежнасьці ад асаблівасьцяй работы зьмяняць расцэнкі да 10 проц. у той ці іншы бок.

Па прагрэсыўна-прэміяльнай аплаце працы

1. Для вядучых груп рабочых на сартавачных і распарадчых станцыях, якія абслугоўваюць манэўровую работу (паравозныя манэўровыя брыгады, саставіцелі, счэпшчыкі, башмачнікі і стрэлачнікі) устанавіць павышаныя прагрэсыўныя расцэнкі: за пераапрацоўку нормы да 10 проц. — у паўтары разы, в звыш 10 проц. — у два разы, пачынаючы з першага процанту пераапрацоўкі.

Устанавіць, што вылічэньне прагрэсыўкі робіцца па разультатах месячнай зьдзельнай работы (за вылічэньнем часу на адпускі, хваробу).

2. Стварыць пры кіраўніцтвах дарог і раёнаў спэцыяльны прэміяльны фонд (прыкладна, адзін-два проц. ад фонду зарплаты) для прэміяваньня рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу на вытворчасьці (начальнік дэпо, вагонага вучастку, станцыі, дыстанцыі шляху, сувязі, інжынэры, майстры) за высокія якасныя паказальнікі работы, перавыкананьне паасобных паказальнікаў пляну пры выкананьні апошняга ў цэлым па дэпо, вагоннаму вучастку станцыі, дыстанцыі, за зьніжэньне нормы прастою вагонаў на станцыях, за зьніжэньне процанту хворых паравозаў і вагонаў, за перавышэньне пляну па рамонту, скарачэньне тэрмінаў прастою ў рамонце паравозаў і вагонаў, за якаснае становішча шляху і г. д.

3. У мэтах забесьпячэньня высокай якасьці рамонту паравозаў строга прытрымівацца пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР аб паніжэнай аплаце работы пры браку і матар'яльнай адказнасьці работнікаў за псаваньне матар'ялаў.

Устанавіць, што паравозныя брыгады, у выпадку выяўленьня імі браку пры прыёмцы адрамантаванага паравоза, атрымліваюць прэмію ў разьмеры 10 проц. ад кошту рамонту забракаваных дэталяй.

Брыгадам па бягучым рамонце паравозаў устанавіць прэмію ў разьмеры 15 проц. ад месячнага заработку, калі яны на працягу ўсяго месяца здаюць адрамантаваныя імі паравозы бяз браку і недаробак.

4. За добрае кіраўніцтва работаю сваёй брыгады, нагляд за своячасовым выкананьнем і якасьцю рамонту ўстанавіць брыгадзірам комплексных (аб'яднаных) брыгад па рамонце паравозаў і вагонаў даплату ў разьмеры 10 проц. ад тарыфнай стаўкі.

Лінейных брыгадзіраў прэміяваць у разьмеры месячнага акладу два разы ў год за спраўнае ўтрыманьне і добраякасны рамонт дарогі.

Па тарыфнай стаўцы

Устанавіць павышаныя месячныя тарыфныя стаўкі для наступных прафэсій:

1. Паязным і змазчыкам:

першага разраду — 170 руб. замест існуючай 105 руб.;

другога разраду — 140 руб. замест існуючай 105 руб.

2. Галоўным кандуктарам:

пасажырскіх цягнікоў — 200-250 р. замест існуюч. 145 руб.

таварных цягнікоў — 160-180 руб. замест існуюч. 135 руб.

Устанавіць, што за ўзорную работу галоўныя кандуктары прэміююцца па паўгодзьдзях асабіста начальнікам дарог у разьмеры да месячнага акладу.

3. Саставіцелям цягнікоў — 170-200 руб. замест існуючай 137-169 р.

4. Счэпшчыкам цягнікоў — 135-155 руб. замест існуючай 115-130 руб.

5. Башмачнікам (тармазным) — 125-145 руб. замест існуючай 102-115 руб.

6. Стрэлачнікам старшым — 140-150 руб. замест існуючай 113 руб.

7. Стрэлачнікам, якія абслугоўваюць найбольш адказныя пасты сартавачных і распарадчых станцый, — 102-115 руб. замест існуючай 82-95 руб.

8. Кваліфікаваным рабочым дэпо па рамонце таварных і пасажырскіх вагонаў:

Для дарог першай катэгорыі стаўка першага разраду — 87 р. 50 к. замест існуючай 79 руб. 50 к. — 83 руб.;

для дарог другой катэгорыі стаўка першага разраду 74 р. 25 к. замест існуючай 67 р. 50 к. — 70р. 50 к.;

для дарог трэцяй катэгорыі стаўка першага разраду — 69 руб. 50 кап. замест існуючай 63 р. 25 к. — 65 р. 10 к.

Па зарплаце і прэміяваньні інжынэрна-тэхнічных работнікаў

1. Устанавіць, што інжынэр, які працуе на вытворчасьці на станцыі, дэпо, вагонным вучастку, дыстанцыі шляху і сувязі павінен атрымліваць аклад вышэй на 15 проц., чым роўнацэнны па кваліфікацыі работнік у апэратах раёнаў, у кіраўніцтве дарог і НКШЗ.

2. Устанавіць наступныя павышаныя службовыя аклады для інжынэраў і тэхнікаў, якія працуюць непасрэдна ў дэпо, вагонных вучастках, станцыі, дыстанцыі шляху і сувязі і на рамонтных заводах:

Дэпо паравознае:

начальніку асноўнага дэпо першага разраду — 600-700 замест 450-550 руб.;

начальніку асноўнага дэпо другога разраду — 500-600 руб. замест 410-500 руб.;

начальніку асноўнага дэпо трэцяга разраду — 425-500 руб. замест 375-450 руб.;

намесьніку начальніка дэпо першага разраду — 550-650 руб. замест 400-475 руб.;

намесьніку нач. дэпо другога разраду — 450-550 руб.;

намесьніку начальніка вагоннага вучастку, намесьніку начальніка дэпо трэцяга разраду — 400-450 руб. замест 330-375 руб.;

майстру дэпо першага разраду — 450-550 руб. замест 360-425 руб.;

майстру дэпо другога разраду — 400-450 руб. замест 325-370 руб.;

майстру дэпо трэцяга разраду — 350-400 руб. замест 300-340 руб.;

дзяжурнаму па дэпо першага разраду — 400-450 руб. замест 275-335 руб.;

дзяжурнаму па дэпо другога разраду — 350-400 руб. замест 275-335 руб.;

дзяжурнаму па дэпо 3-га разраду — 300-350 руб. замест 230-280 руб.;

машыністу-настаўніку — 400-450 руб. замест 275-335 руб.

Вучастак вагоннай гаспадаркі:

начальніку вагоннага вучастку першага разраду — 600-700 руб.;

начальніку вагоннага вучастку другога разраду — 500-600 руб.;

начальніку вагоннага вучастку трэцяга разраду — 425-500 руб.;

нам. начальніка вагоннага вучастку першага разраду — 550-650 руб.;

нам. начальніка вагоннага вучастку другога разраду — 450-550 руб.;

пам. начальніка вагоннага вучастку трэцяга разраду — 400-450 руб.;

майстру вагоннага вучастку першага разраду — 450-550 руб.; замест 290-375 руб.; майстру вагоннага вучастку другога разраду — 400-450 руб. замест 260-340 руб.; майстру вагоннага вучастку трэцяга разраду — 350-400 руб. замест 260 — 320 руб.

Станцыя:

начальніку станцыі па-заклясной—600-700 руб. замест 500-550 руб.,

начальніку станцыі першай клясы — 500-600 руб. замест 425-450 руб.,

начальніку станцыі другой клясы — 375-450 руб. замест 325 руб.,

нам. начальніка па-заклясной станцыі — 500-600 руб. замест 375-400 руб.,

нам. нач. станцыі першай клясы — 400-500 руб. замест 360-425 руб.,

майстру дэпо другога разраду — 400-450 руб. замест 325-370 руб.,

майстру дэпо трэцяга разраду — 350-400 руб. замест 300-340 руб.,

стэнцыйнаму дыспэтчару па-заклясной станцыі—350-400 руб. замест 300-325 руб.,

стэнцыйнаму дыспэтчару станцыі першай клясы — 325-350 руб. замест 300 руб.,

дзяжурнаму па станцыі па-заклясной —350-375 руб. замест 300 руб.,

дзяжурнаму па станцыі першай клясы 275-300 руб. замест 255 руб.,

дзяжурнаму па станцыі другой клясы — 225-250 руб. замест 205 руб.

Раён:

начальніку раёну — 600-700 руб. замест 500-600 руб.,

пам. па эксплёатацыі — 550-650 руб.,

старш. дыспэтчарам — 475-550 руб. замест 410-500 руб.,

дыспэтчарам — 400-450 руб. замест 360-390 руб.

Дыстанцыя шляху:

начальніку дыстанцыі першага разраду — 600-700 руб. замест 493-540 р.,

начальніку дыстанцыі другога разраду — 500-600 руб. замест 418 руб.,

начальніку дыстанцыі трэцяга разраду

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ 2-му УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-ЎДАРНІКАЎ!

Мабілізуем усе сілы, усю энэргію на ўзорнае правядзеньне ўборкі ўраджаю і пастаўкі сельска-гаспадарчай прадукцыі дзяржаве

ЗЬЕЗД ЎДАРНІКАЎ КАЛГАСНАЙ СПРАВЫ

Сёньня адрываецца другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

Заўтра — 13-годзьдзе вызваленьня БССР ад акупантаў.

13 год назад пад Менскам узьвіўся пераможны чырвоны сьцяг. Хто з нас ня помніць, што пакінулі пасьля сябе белякупанты! Спаленыя гарады. Зруйнаваныя вёскі. Акрываўленыя палі, густа пароснымі лесам шыбеніц.

Хто з нас забудзе, што прынесла з сабой акупацыя. Растрэлы і катаваньні. Бізун памешчыкаў і кулацкую кабалу. Дзікі нацыянальны ўціск, які знайшоў сваё яркае выяўленьне ў прымусовай палянізацыі.

І гэта контрэвалюцыйныя беларускія нацдэмы называлі «адраджэньнем самабытнай Беларусі». Беларуская контрэвалюцыя прадавала нашу краіну агулам і ў раздроб. Верныя лёкаі акупантаў — нацдэмы з аднолькавай радасьцю лізалі боты і Вільгельму, і рускім белагвардзейскім генэралам, і францускім інтэрвэнтам, і польскім імпэрыялістам. Прадацца каму хочаце, хто больш заплаціць, толькі-б задушыць Савецкую Беларусь, толькі-б затапіць у крыві рэвалюцыйную барацьбу рабочых і сялян, толькі-б адпавіць уладу буржуазіі, уладу паменчыкаў. Гэтага дамагаліся контрэвалюцыйныя беларускія нацдэмы.

Вораг пралічыўся. Стаўка нацдэмаў на адчаўленьне капіталізму біта.

На абарону нашай Савецкай Беларусі грудзьмі стаў пралетарыят усёй краіны Саветаў. Пры брацкай гераічнай дапамозе пралетараў і працоўных усяго СССР, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі мы перамаглі ў барацьбе з акупантамі. Чырвоная армія сваёй самаадданай барацьбой за вызваленьне БССР упісала ў гісторыю слаўную незабыўную старонку.

І сёньня дэлегаты зьезду са сваёй зьездаўскай трыбуны скажуць, што цяпер робіцца на тых самых палёх і ў тых самых вёсках, дзе 13 год назад дымяліся руіны, стаялі шыбеніцы, сьвісьцеў бізун і панаваў паменчык.

Дэлегаты скажуць, што на гэтых палёх цяпер квітнеюць і наліваюцца густыя і буйныя калгасныя ўсходы, якія абяцаюць высокі ўраджай.

Дэлегаты падзеляцца вопытам барацьбы сваіх перадавых калгасаў за выкананьне гістарычнага лёзунгу тав. **СТАЛІНА:**

— Зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі і ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

Гэты лёзунг выклікаў новы магутны ўздым сярод калгасных мас. Першая бальшавіцкая сяўба другой сацыялістычнай пяцігодкі ярка прадэманстравала гігантскія зрухі, якія адбыліся ў сьвядомасьці калгасных мас, у іх адносінах да калгаснай працы.

На новую ступень узьнялося сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасах. Калгасныя масы вылучылі са сваіх радоў сотні і тысячы перадавых арганізатараў калгаснай вытворчасьці, перадавых байцоў за калгасную справу. І сёньня яны — лепшыя людзі новай калгаснай вёскі—дэлегаты зьезду абмяркоўваюць, як лепш і хутчэй правесьці ўборку і выканаць абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай, як ажыцьцявіць сацыялістычны дагавор з Заходняй вобласьцю на дэтэрміновае і высакаякаснае правядзеньне ўборкі і свячасовую здачу збожжа і іншых с.-г. прадуктаў пралетарскай дзяржаве.

Вялікія, рашаючай важнасьці задачы стаяць перад другім зьездам калгасьнікаў-ударнікаў. І самая першая, самая важная з іх — у тэрмін і добра правесьці пастаўкі с.-г. прадуктаў дзяржаве па ўстаноўленых нормах, каб кожны калгас і кожны працоўны аднаасобнік сумленна разьлічыўся з пралетарскай дзяржавай, сумленна выканаў свае абавязацельствы.

Сяўба у гэтым годзе праведзена на 20 дзён раней, чым летась, пры значна лепшай і больш высокай якасьці работ. Але ўсё-ж трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што сваіх магчымасьцяй мы не скарысталі, што тэрміны сяўбы ня вытрыманы, што пасеўная кампанія была недапушчальна расьцягнута.

Гэты буйнейшы недахоп трэба пабальшавіцку выправіць ударкай убаркай і пастаўкай збожжа новага ўраджаю. Дэлегат зьезду павінен стаць сапраўдным арганізатарам збожжаздачы. У гэтым яго найпершы абавязак. Па гэтай рабоце будуць меркаваць, як ён апраўдвае аказанае яму таварыствам высокае давер'е, як ён на справе змагаецца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Жалезны адпор малейшым антыдзяржаўным тэндэнцыям. Калгас, які прабуе ашукаць дзяржаву, утаіць ураджай, дапамагае нашым клясавым ворагам, дапамагае кулаку. Дэлегаты зьезду — калгасьнікі-ўдарнікі павінны быць у першых радох у барацьбе з антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі, з кулацкімі спробамі ашукаць дзяржаву.

Не зацягваць абмалоту, з першых-жа дзён малацьбы разгарнуць пастаўкі і да тэрміну здаць дзяржаве, па цьвёрдых устаноўленых нормах збожжа, бульбу і іншыя с.-г. прадукты, прычым самай высокай якасьці, — вось у чым задача задач.

Уборка на парозе. Азімыя і яравыя хутка высыпаюць. А як у нас справа з падрыхтоўкай, прапалачнай кампаніяй, з рамонтам с.-г. інвэнтару, з канём? Зусім нездавальняюча! Куды гэта варта, што яшчэ і да сёньняшняга дня ў нашай рэспубліцы ня скончана першай прополкі ільну. Куды гэта варта, што мы яшчэ да гэтага часу не ўзаралі чыстых папараў і марудна правозім рамонт уборачных машын і с.-г. інвэнтару.

Асаблівая сур'ёзна стаіць зараз пытаньне з сенаўборкай. Яна павінна быць скончана ва што-б там ні стала да пачатку ўборкі збожжавых і ільну. Аднак, толькі паасобныя раёны разгарнулі сенажаньне.

Не марудзіць ні адной гадзіны! Скасіць, высушыць і ўбраць сенажаць у самы бліжэйшы час, поўнасьцю выканаць плян сеназагатовак — справа гонару кожнага калгасу.

Зьезд павінен забясьпечыць рашаючы і круты пералом у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі.

Трэба сапраўды ўзьняць усю масу калгасьнікаў, усіх працоўных аднаасобнікаў на неадкладнае завяршэньне папарава-прапалачнай кампаніі і падрыхтоўкі да ўборкі.

Трэба загадзя правільна рассавіць сілы, прывесьці ў поўную гатоўнасьць кожную машыну і ўвесь с.-г. інвэнтар, падрыхтаваць усё для бесперабойнага абмалоту і здачы збожжа.

Фронт уборачнай — гэта фронт абвостранай клясавай барацьбы. Кулак недабіт. Кулак шалёна імкнецца сарваць уборачную кампанію, разбурыць нашы калгасы з сярэдзіны, раскрасьці сацыялістычную грамадзкую маемасьць.

Патрэбна асаблівая пільнасьць, асаблівая непрымірнасьць да малейшых вылазак клясава-варожых элемэнтаў.

Захаваць кожны засеяны гэктар, арганізаваць пільную ахову калгасных ўраджаяў,—у гэтай адказнейшай рабоце дэлегаты зьезду павінны праявіць максымум настойлівасьці, энэргіі і ініцыятывы.

Няма сумненьня, што другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў зьяўляцца магутнай зброяй мабілізацыі калгасных мас і працоўных аднаасобнікаў — заўтрашніх калгасьнікаў на бальшавіцкае правядзеньне ўборкі і паставак с.-г. прадуктаў дзяржаве.

ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ЎДАРНІКАМ КАЛГАСНАЙ БУДОЎЛІ — ДЭЛЕГАТАМ ДРУГОГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-ЎДАРНІКАЎ!

Шуманская Вольга Сьцяпанаўна

—калгасьніца-ўдарніца 2-й паляводчай брыгады, дэлегатка зьезду ад калгасу „Перамога", Чырвона-Слабодзкага р.

НАШЫ КАЛГАСЬНІКІ СТАНОВЯЦЦА ЗАМОЖНЫМІ

Наш калгас **«ПЕРАМОГА»** — адзін з буйнейшых у раёне, у ім аб'яднана 98 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Зараз праўленьне нашага калгасу

асаблівую ўвагу зьвярнула на арганізацыю работ і расстаноўку сіл у часе жніва, малацьбы і перавозкі збожжа.

Усе нашы тры паляводчыя брыгады ведаюць, дзе, на якіх вучастках і якімі машынамі яны будуць праводзіць уборку і колькі якая брыгада павінна абмалаціць збожжа. Да кожнай брыгады прымацавана па адной жнівярцы, а рабочая сіла ў брыгадах разьбіта на звяньні. Намі ўжо сабрана патрэбная колькасьць мяхоў, адрамантаваны вазы. Для работы на жнівярках вылучана 7 пар лепшых коняй. Дзесяць слабых коняй з 72-х пастаўлены на адпачынак.

Малацьбу ў калгасе будзе праводзіць МТС, з якой ужо заключан дагавор.

УБОРКУ ЖЫТА МЫ МЯРКУЕМ ПРАВЕСЬЦІ НЯ БОЛЬШ ЯК ЗА 8 ДЗЕН, ЯЧМЕНЮ ЗА 4 ДНІ І АЎСА ЗА 2 ДНІ.

Здачу збожжа дзяржаве мы цьвёрда дагаварыліся пачаць з першага абмалоту і здаць у наступнай колькасьці: жыта 78 цэнтн., пшаніцы 15 цэнтн., аўса 68 цэнтн., ячменю 82 цэнтн. і гароху 4½ цэнтн.

Мы атрымалі адно месца на другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў, і гэта недарма. У часе пасеўнай наш калгас працаваў па-ўдарнаму і цяпер амаль усе калгасьнікі працуюць з вялікай ахвотай і адносяцца да работы акуратна.

Нашы калгасьнікі ўбачылі, што калі добра працаваць, дык толькі ў калгасе можна прысьці да заможнага жыцьця. **ЖЫТА МЯРКУЕМ ЗЬНЯЦЬ НЯ МЕНШ 11 ЦЭНТ. З ГА.** Пасьля выкананьня паставак дзяржаве, стварэньня патрэбных фондаў і ўсіх разьлікаў **МЫ ДУМАЕМ ВЫДАЦЬ КАЛГАСЬНІКАМ НА ПРАЦАДЗЕНЬ ПА 6 КГР. ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР — СУПРОЦЬ ЛЕТАШНЯГА 1 КГР., БУЛЬБЫ 9 КГР., СУПРОЦЬ 4 КГР. У МИНУЛЫМ ГОДЗЕ.**

Такім чынам наша становішча на вачох паляпшаецца. Дзякуючы таму, што мы ўступілі ў калгас, жанчынам стала працаваць значна лягчэй. **Ужо ў сёлетнюю ўборачную кампанію большая палова жыта і яравых будзе зжата машынамі.**

ЗАЙЦАЎ

—дэлегат ад калгасу імя „Першага мая", Мазырскага раёну

ПАЛІТАДДЗЕЛ—ВЯЛІКАЯ ПАДМОГА КАЛГАСАМ

Наш калгас абслугоўвае раённая МТС. Сёлета пры МТС партыя арганізавала палітаддзел. Гэта ў жыцьцё калгасаў унесла вялікія перамены. З першых дзён работы палітаддзелу мы пераканаліся, што ў калгасы прыбыла вялікая падмога.

За час пасеўнай у нашым калгасе пабываў тры разы начальнік палітаддзелу тав. **ЦЫБЭРАЎ.** Ён мне, як старшыні, шмат дапамог у арганізацыі працы. Напрыклад, Цыбэраву належыць ініцыятыва па арганізацыі зьвеньняў у брыгадзе, якія потым на прополцы далі высокую прадукцыйнасьць працы, сыстэматычна перавыконваючы нормы выпрацоўкі.

Правяраючы гутарку з калгасьнікамі, тав. Цыбэраў завастрыў увагу на ахове калгаснага ўраджаю і мы вызначылі двух палявых вартаўнікоў і аб'езчыка. Палітаддзел практычна дапамог калгаснаму актыву выкрыць і вычысьціць сем клясава-варожых сямей, якія «ціхай сапай» пікодзілі калгасу.

Прополку яравых пасеваў і гародаў закончылі да 1-га чэрвеня. Прапалаты ўсе палявыя культуры, як авёс, пшаніца, лён. Абаралі бульбу, а 15 га раньняй бульбы абаралі два разы.

Посьпех у прополцы нам забясьпечыла высокая працоўная дысцыпліна. Закон III-й Сесіі ЦВК СССР адносна барацьбы з гультайствам у калгасах нашы калгасьнікі ведаюць на зубок. Гультаі пасьпталі вастраву гэтага закону. За кявыхад на работу аштрафаваны па 5 працадзён: Назаренка Карп і Процька Павел, пры гэтым яны атрымалі папярэджаньне, што пры паўтарэньні падобных зьявішч якы будуць выключаны з калгасу.

Пасьля гэтых мер, цесна зьвязаных з растлумачальнай работай, рэзка ўзьнялася прадукцыйнасьць працы. Прапулы зусім зьніклі. Вырасьлі рады ўдарнікаў.

З 1-га ліпеня пачалі сенаўборку. Ня гледзячы на няспрыяючае надвор'е, убрана 25 проц. сенажаці. Мяркуем да 20 ліпеня сенаўборку скончыць поўнасьцю.

Выкананьне ўсіх выпэйзералічаных работ зьяўляецца галоўнай справай у падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю збожжавых. Жнівяркі, малатарню, калёсы адрамантавалі даўно. Няхай толькі сьпее колас новага ўраджаю! Мы гатовы яго сустрэць як дарагога гасьця! Дамо яму рады!

Адказнасьць за выкананьне першай калгаснай запаведзі — здачу збожжа дзяржаве — ускладзена на брыгадзіраў: Рубанікава М. і Ціхняка Хведара. Аб тым, што з першага снапа ўраджаю трэба здаць дзяржаве, нашы калгасьнікі ўсьвядомілі цьвёрда.

Палітаддзел вядзе нас па верным шляху, аб гэтым кажуць розьультаты.

ЗДАЕМ ДЗЯРЖАВЕ СЕНА З НОВАГА ЎРАДЖАЮ

ПУХАВІЧЫ, 7 (па тэлеграфу).

Пухавіцкі раён сустракае другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў масавым разгортваньнем сенаўборачнай кампаніі.

Змагаемся за **ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ** абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай пад лёзунгам: **«ЗДАЦЬ СЕНА З ПЕРШАГА ЎКОСУ ДЗЯРЖАВЕ».**

6 ліпеня 19 калгасаў МТС у адзнаку другога раённага зьлёту і другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў здалі 13 ТОН сена з НОВАГА ўраджаю.

РАЙКОМ.
ПАЛІТАДДЗЕЛ, РВК.

ЮРЧАНКА С. А.

—дэлегат ад калгасу „Чырвоная Ніва", Лоеўскага раёну

ЗІРНЕЦЕ НА НАШЫ ПАЛІ...

Для таго, каб сказаць, як мы працуем, трэба зірнуць на нашы калгасныя палі.

Пераліваецца дёмнымі хвалямі рослае з буйным коласам жыта. Кусьцісты авёс выкідвае важкае вецьце. Доўгія пусы ячменю шалясьцяць на ветры. Бульба, расхінаючы зямлю, моцна ірвецца на паверхню.

Клопат, пільнасьць, усе сілы аддаем мы на тое, каб зьняць найвышэйшы ўраджай. За турботы поле плаціць нябачным да гэтага году ў нашай мясцовасьці ўраджаем. **Па самых асьцярожных падліках гэктар жыта дасьць ня менш 12 цэнтн., азімая пшаніца — 13 цэнтн., яравыя збожжавыя — 9 цэнтн., бульба — 130 цэнтн.**

А гэктараў у нас засеяна багата. Пад яравымі 292 га, жыта — 80 га, ды пшаніцы азімкі — 8 га.

Чаму ў нас добры ўраджай?

Возьмем жыта. Апрача таго, што поле было выпулыхнена, як пасьцель, на 25 га ўнесена па 40 вазоў гною. Па калюшыніцы пасеялі 20 га, а на астатнюю плошчу накладзена штучнае ўнаеньне. Гною было шмат таму, што калгас назапасіў торфу і падсьцілаў ім скацінае ў перамежку з саломай.

Цяпер аб яравых. Скончылі сяўбу на 5 дзён да ўрадавага тэрміну — 15 мая. Замест 259 га засеялі 292. На 33 га больш. Амаль усю зямлю засеялі, толькі засталося 25 га пад чысты папар, які мы зараз-жа пасьля сяўбы ўзаралі і забаранавалі, а гэтымі днямі будзем перавораць у другі раз.

У нашым калгасе дзьве вытворчыя брыгады. Яны ўвесь час паміж сабою спаборнічаюць. Вясною пярэшнятва ўзяла брыгада **РАБЧАНКІ АСТАПА,** які раней скончыў сяўбу і ўзяў на буксір брыгаду Кацэбы. Кацэба пакрыўдзіўся і пастараўся ўзяць пярэшнятва на прополцы. Для гэтага ён не дасыпаў начамі, апітаваў сваіх таварышоў абагнаць Рабчанку. Арганізаваў узорныя ясьлі. Усе жанчыны, як адна, выйшлі на прополку. І вось Кацэба скончыў прополку на сваім вучастку 25 мая, а Рабчанка 30 мая. Кацэба выйграў таму, што ў яго брыгадзе аказалася больш ашасьць такіх, як Юрчанка Наста, якая праполвала ня дзесяць сотак, а дваццаць.

Да нашага раённага зьезду калгасьнікаў плян прополкі выканан на 100 проц. Аўса праполата 56 га, ячменю — 37 га, ільну — 15 га, канапель — 10 га.

Хачу сказаць яшчэ пра адну вялікую заслугу нашых жанчын. Яны матыгамі раскарчавалі 15 га з-пад лесу пад засеў проса. І проса на тым месцы зямлю даяро, на лес гледзячы расьце.

Закончыўшы прополку, сабралі мы ўсіх калгасьнікаў на агульны сход, праглядзелі працоўныя зашыткі. Камісія па прыёмцы работ далажыла пра якасьць работы. Расклалі штодзённі, у якіх на чырвонай дошцы запісаны ўдарнікі, а на чорнай — гультаі і зрыўшчыкі. Горача паспрачаўшыся, рашылі прэміраваць 23 чалавек, як герояў пасяўной і прапалачнай.

Сёлетні ўраджай удвая больш за леташні, таму і на працадзень прыдзецца ўдвая больш, чым летась. Падлік паказвае, **ШТО СЁЛЕТА НА АДЗІН ПРАЦАДЗЕНЬ ПРЫПАДАЕ КАЛЯ 5 КЛГР. ЗБОЖЖАВЫХ І 12 КЛГР. БУЛЬБЫ.**

Добры ўраджай абавязвае нас быць асабліва добрасумленнымі ў выкананьні сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. Даючы, дзяржава ад нас па трабуе ня так многа. Даць з аднаго га, якія дае 12 цэнтн. ураджаю, 85 кілё, лічба зусім нязначная. **МЫ РАШЫЛІ НАЛЕЖАЧЫЯ З НАШАГА КАЛГАСУ 182 ЦЭНТН. ЗБОЖЖА ЗДАЦЬ З ПЕРШАГА АБМАЛОТУ.**

Нарэшце, скажу, што наш калгас — адзін з лепшых у Лоеўшчыне. Коні як лялькі. Інвэнтар спраўны. Будуем новы сьвіран для сушкі новага ўраджаю. Пабудавалі абору і стайню. Не забываем і пра нашых слабейшых суседзяў. Калгасу «Палеская праўда» дапамаглі конымі, калгасу «Громкі» — насеньнем.

Аднаасобнікі бачаць нашу працу і жыцьцё. Штодзённа яны прыносяць заявы аб прыёме ў члены калгасу. За час прополкі прынялі сем новых гаспадарак. Такім чынам, калгас «Чырвоная ніва» зараз налічвае 80 гаспадарак. Адным словам, нашага палку прыбывае.

КВЯТНАЯ ХАСЯ

—дэлегатка ад інтэрнацыянальнага калгасу „Прагрэс", Нараўлянскага раёну

ПРАЦУЕМ ДРУЖНАЙ КАЛГАСНАЙ СЯМ'ЁЙ

У калгасе **«ПРАГРЭС»** дружна працуюць 54 сям'і розных нацыянальнасьцяй, 20 яўрэйскіх, 4 латыскіх, 1 нямецкая і 29 беларускіх. Асабліва сябруюць паміж сабою калгасьніцы. Перад іх ценкай рабочай сям'ёй адступіла назад нацыянальная варожасьць, якая векамі насаджвалася царскім урадам.

Вось сьпіс нашых лепшых ўдарніц па прополцы: Вэйс Ганна, Цылько Салюта, Дваронская Ульяна, Курц Алена, Цылько Ўстыньня, Жулей Вольга, ну і я таксама, бо інакш бы мяне ня выбралі на гэты зьезд.

Сёлета да 1-га ліпеня я выпрацавала 135 працадзён. Лічба не малая. Трэба ведаць, што сёлета, калі ўсходы стала ўжывацца вьдзельшчына, зарабіць працадзень не так ужо лёгка. Па сабе гэта бачу. Працую кожны дзень. Няма ніводнага прагулу. Норму выконваю заўсёды, а часта бывае, што і перавыконваю, адным словам працадзень дарма не даецца.

За тое сёлетні працадзень будзе каштаваць не адзін кілёграм, як гэта было летась, а 3 клгр. збожжа, і бульбы ня 3, а 10 клгр.

Добрасумленная праца раджае высокі ўраджай. У калгасе я 5 год, а яшчэ ніколі не бачыла такога клопату і турбот аб полі, як у гэтым годзе. А ўсё ад таго, што калгасьнікі блізка прынялі да сэрца словы нашага любімага правадыра тав. Сталіна аб тым, што калгасьнікаў трэба зрабіць заможнымі. Гэты бальшавіцкі сказ пасеяў вялікую радасьць у калгасах.

І стараемся, нешкадуючы сіл. Пачынаючы ад раньняй вясны калгасьнікі ад цямна да цямна завіхаюцца на полі. Плян сяўбы яравых выкананы на 111 проц. Засеялі 169 га. Папараў узьнялі не 25 га, як гэта сказана ў пляне райза, а 60 га.

Як толькі зьявіліся першыя ўсходы, брыгады ўзяліся палоць іх. Прапалолі раз, а потым, калі поле стала займаць зноў сьвірапа, прапалолі ў другі. Гэта каштавала не малых трудоў.

У той час, калі мы змагаліся з пустазельлем, Ірэй Аўдоцьця ня выходзіла на працу, ды яшчэ і суседак падбухторвала не хадзіць на прополку. З Аўдоцьцяй мы разьлічыліся як сьлед. Аштрафавалі працаднямі, сходам далі ёй суровую вымову з папярэджаньнем.

Зараз наш калгас уступае ў самую гарачую работу. Добры ўраджай патрэбна ўбраць бяз страт, каб хапіла здаць дзяржаве і на працадзень засталося набольш. Я ўпэўнена, што мы гэтага дабіемся. Сеялі дружна, убіраць будзем яшчэ спраўней, бо рука калгасьніка адчувае важкасьць калгаснага ўраджаю, за якім стаіць наша заможнае жыцьцё.

Зьверху ўніз: т. т. РАЛЬКО — старшыня калгасу «Чырвоны Вартаўнік», Чырвона-Слабодзкага раёну, КАНАНОК — дэлегатка кал. «Варашылава», Брагінскі р., ГРАКОЎ — брыгадзір кал. «Авангард», Лоеўскага раёну, АЗБЭЛ— дэл. нацыянальнага яўрэйскага кал. «Праца», Хойніцкі раён.

СЕНА ЗЬВЕЗЕНА Ў ГУМНЫ

КРЫЧАЎ, 7.

У адзнаку другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў перадавыя калгасы раёну па-ўдарнаму разгарнулі сенаўборку. Так калгас «Барацьбіт», Бацьвінаўскага сельсавету цалкам скасіў 48 га сухадольнага лугу і ўсё сена зьвёз у гумны. Закончыў касьбу сухадольных лугоў калгас «Пралетарская перамога», Міхееўскага сельсавету.

ДЭЛЕГАТЫ ПРЫЕХАЛІ Ў МЕНСК

Чыгуначнікі з чырвонай павязкай на рукаве, на якой белымі літарамі чотка напісана «дзяжурны» неспакойна заходзілі на пэрону. З хвіліну на хвіліну павінен з поўдня прыбыць цягнік, у якім едуць мазырская, лоеўская, жыткавіцкая, тураўская, брагінская, хойніцкая дэлегацыі на ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

Каля дзяжурных зьбіраюцца групы людзей. Гэта — прадстаўнікі пралетарскай сталіцы сустракаюць герояў бальшавіцкай вясны.

— Скажэце, у якім вагоне едзе лоеўская дэлегацыя? — паводзіць спраўку ў дзяжурнага жанчына.

— У чацьвертым.

— А тураўская?

— А мазырская?

Кожнаму хочацца ведаць, да якога вагона кінуцца сустрэць сваіх падшэфных, кожнага прывозьць турбота аб сваіх сяброх з палёў.

***

Лоеўскія, сюды! — зьбірае да сябе калгасьнікаў тая жанчына, што хвіліну назад наводзіла спраўкі ў дзяжурнага. Яна дошла, за руку, вітаецца з кожным дэлегатам.

— Куды нам цяпер? — даверыўшыся сваім шэфам пытаецца загарэлы ад сонца калгасьнік, у якога з-пад шапкі відаць кончыкі срэбных валасоў старасьці.

— Пойдзем да нас, — запрашальна адказаў яму чыгуначнік з чырвонай павязкай.

Дэлегаты ў поравешку з рабочымі, шумным натоўпам накіроўваюцца ў 1-ы клюб вакзалу, дзе іх чакае чыстата і прывабная ўтульнасьць.

Доўгія сталы накрыты чырвонымі абрусамі. Акуратна ў радок саставлены стулы. На сталох — газэты, часопісы, кнігі. Калгасьнікі хціва зачэрпваюць у сьвежыя газэты, шалясьцяць лісты часопісаў.

— Як сёлета ўраджай? — па сяброўску пытае ў калгасьніка з Лоева счэпчык вагонаў.

— Сьцяной стаіць! Колас наліўся добра, умалот будзе вялікі. Я штосьці ня помню, калі быў такі ўраджай жыта, — ахвотна апавядае дэлегат.

— Убраць толькі трэба акуратна!

— І ўбярэм.

Пакуль чыгуначнікі гутараць з калгасьнікамі, частуюць іх гарбатай, падыходзіць трамвай, які адвозіць дэлегатаў на Плац Волі, дзе знаходзіцца мандатная камісія.

***

— Як зваць?

— ГАРОШКА МАРЫЛЯ.

— Сацыяльнае паходжаньне?

— Батрачка.

— Колькі год?

— Трыццаць пяць. У калгасе з 1930 году.

З далейшай размовы паміж дэлегаткаю і рэгістратарам мы ўзнаем, што Гарошка Марыля да калгасу нічога ня мела. За ўдарную работу ў калгасе пры разы прэміравалася, зьяўляецца кандыдатам у члены праўленьня і членам сельсавету.

Потым шлях дэлегата ідзе так: бань, абед і ўтульныя пакоі «Эўропы» і іншых менскіх гасьцініц, у якіх дэлегаты адпачываюць перад заўтрашняй адказнай работай.

***

Да 18 гадзіны дня на зьезд прыбылі наступныя дэлегацыі: Чырвонаслабодзкая, Камарынская, Вуда-Капалёўская, Крычаўская, Асьвейская, Жыткавіцкая, Петрыкавіцкая, Тураўская, Брагінская, Мазырская, Лоеўская і інш. Прыбыло больш 200 дэлегатаў. Вечарам з мінскім цягнікам прыбылі дэлегаты з паўночных і ўсходніх раёнаў рэспублікі.

ЛЕН ПРАПАЛОЛІ

БЯЛЫНІЧЫ, 7. (Па тэлеграфу).

У адзнаку другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў ударнікаў калгасы Бялыніцкага раёну разгарнулі ўзмацнілі тэмпы падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Па 6-е ліпеня калгасы поўнасьцю скончылі прополку ільну. Прополка праведзена на плошчы ў 2456 га.

Райземаддзел.

ЗЬЛЕВА НАПРАВА: т. т. ВАРАНЕЦ—брыгадзір калгасу «Чырвоны Кастрычнік», Брагінскага раёну, БУХГАРЭВІЧ дэлегатка калгасу «Чырвоная ніва», Чырвона-Слабодзкага раёну, ЛЯСКАНОЎСКІ — дэлегат калгасу «Гомельскі пралетары», Лоеўскага раёну, АМЕЛЬЧАНКА — дэлегат калгасу імя Молатава, Хойніцкага раёну.

Линейная калибровочная мишень LR1-BE4-V2

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ КАЛГАСНАГА ЛАДУ

Прамова сакратара ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКАГА на зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў Віцебскага раёну 6 ліпеня 1933 г.

Таварышы! Дазвольце ад імя Цэнтральнага Камітэту нашай партыі перадаць вам, перадавікам сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, вам, ударнікам і перадавым байцом за ўмацаваньне і канчаткоўную перамогу калгаснага ладу, арміятарам пераможных баёў за сяўбу першага году другой бальшавіцкай пяцігодкі,—гарачае бальшавіцкае прывітаньне. (Апляўдысмэнты).

ВЯЛІЗАРНЫЯ ПЕРАМОГІ СССР—ВЫНІК НЯУХІЛЬКАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ

Таварышы-дэлегаты другога віцебскага раённага зьлёту перадавікоў-калгасьнікаў! Ваш зьлёт сабіраўся, калі ўся краіна падводзіць буйнейшыя палітычныя вынікі першага паўгодзьдзя першага году другой пяцігодкі.

У першым паўгодзьдзі трэба падкрэсьліць у першую чаргу буйнейшую гістарычную перамогу, атрыманую партыяй, рабочай клясай і калгасным селянствам у барацьбе за веснавую сяўбу. Наша савецкая краіна выйшла, наперакор чаканьням міжнароднай буржуазіі, наперакор шматлікім хірыкам клясавага ворага ўнутры краіны, з вялізарнымі колькаснымі і якаснымі паказальнікамі па гэтым важнейшым участку.

Вынікі сяўбы паказалі вялізарную перавагу калгаснага ладу. Лёзунг, выкінуты нашым любімым правадыром і настаўнікам тав. СТАЛІНЫМ аб тым, каб зрабіць калгасы бальшавіцкімі і калгаснікаў заможнымі, стаў здабыткам мільённых калгасных мас, стаў рэальнай справай, у імя якой змагаюцца і перамагаюць гэтыя масы.

Сяўба гэтага году—знамянальны этап у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, за ўзьнёсьце і палепшэньне жыцьцёвага ўзроўню калгасных мас.

Чым тлумачацца перамогі калгаснага ладу?

У першую чаргу палітычнай партыі, якая кіраўнічна была накіравана на ўмацаваньне справы пралетарскай дыктатуры, справы пралетарскай рэвалюцыі, індустрыялізацыі і калектывізацыі нашай савецкай краіны.

Гэтыя перамогі былі падрыхтаваны ў працэсе баёў першай пяцігодкі, палітыкай нашай партыі ў галіне стварэньня ўласнай магутнай тэхнічнай базы, палітыкай будаўніцтва саўгасаў і калгасаў, разгрому капіталістычных элементаў ўнутры нашай краіны, разгрому шкоднікаў элементаў.

Дзякуючы гераічнай самаадданасьці рабочай клясы нашай краіны, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на чале з геніяльным яе правадыром тав. Сталіным, в краіны, як кажа Максім Горкі, забітай, цёмнай, сьпяной, з краіны ліпіцтвага зямляробства СССР ператварылася ў краіну перадавой тэхнікі, самай буйнай, перадавой у сьвеце сельскай гаспадаркі.

За гэтыя гады мы ўклалі ў нашу прамысловасьць 23 мільярды рублёў, без пазык і крэдытаў звонку, стварылі самую перадавую ў сьвеце машынную базу, пабудавалі такія гіганты, як Магнітабуд, Кузьнецкабуд, Днепрабуд, ХТЗ, СТЗ, Берэзьнікоўскі і Бобрыкаўскі хімічныя камбінаты і рад іншых буйнейшых гігантаў. За гэтыя гады мы ўклалі ў сельскую гаспадарку 15.700 мільёнаў рублёў, з якіх 12.700 млн. руб. за кошт дзяржавы, у тым ліку 9.500 мільёнаў руб. капітальных укладваньняў. Такіх сум ня ведае ні адна капіталістычная краіна.

«Параўнайце, — кажа тав. Каганові, — капіталізм бярэ ў рабочых, ён прабіць сялян і кладзе гэта сабе ў кішэню, ператвараючы ў сваю прыватную ўласнасьць, шыкуе, расцранжыроўвае. У нашай дзяржаве кожная рабочая, сялянская капейка, якая ідзе дзяржаве, ідзе ў справу, ідзе ў гаспадарку, ідзе на тое, каб палепшыць рабоча-сялянскае жыцьцё».

За гады першай пяцігодкі мы пабудавалі буйнейшыя заводы сельска-гаспадарчых машын: **Растоўскі саюзсельмаш, из які затрачана 298 млн. руб., Сталінградзкі трактарны завод—125 млн. руб., з іх 35 млн. р. золатам, Чэлябінскі трактарны завод—155 млн. руб., з іх 18 млн. руб. золатам, «Шарыкападшыпнік № 1»—72 млн. руб., з іх 21 млн. руб. золатам, аўтазавод імя Сталіна — 24 млн. руб. золатам і г. д. і г. д.**

Што атрымала працоўнае сялянства ад пралетарскай рэвалюцыі?

У БССР з 22 мільёнаў дзесяціны зямлі да рэвалюцыі належала памешчыкам 11 з паловай мільёнаў, на долю селянства, у тым ліку кулакоў, прыпадала 10 з паловай мільёнаў дзесяцін зямлі. Дарэвалюцыйная Беларусь налічвала 200 тысяч батракоў, абязьзоленых, драпежніцка эксплёатаваных, цярпеўшых галечу, голад і холад, прасьледаваных царскімі жандарамі, чыноўнікамі, кулакамі. За 20 год да рэвалюцыі з Беларусі перасяліліся ў Сібір 642 тысячы чалавек, эміграваві ў Амэрыку 800 тысяч чалавек.

Мы адабралі ад памешчыкаў зямлю, перадалі яе працоўнаму селянству.

У результаце перамог пралетарскай рэвалюцыі ўмацаваўся калгасны лад, больш 50 проц. гаспадарак у БССР ахоплена калгасамі. Мы маем у Беларусі больш 2.000 калгасаў, 400 саўгасаў. Калі раней на індывідуальную гаспадарку прыпадала 3,5 га зямлі, то на кожную калгасную гаспадарку зараз прыпадае 6,5 га. У 1928 г. у БССР было 123 трактары, зараз звыш трох тысяч, ёсьць 61 МТС, буйна распуць калгасныя МТФ і ОТФ.

З адсталай царскай калёніі Беларусь ператварылася ў перадавую індустрыяльна-аграрную краіну. Мы маем такія буйныя заводы, як **Гомсельмаш, магілеўская фабрыка штучнага валакна, бабруйскі дрэвапрацоўчы камбінат, касьцюкоўскі шклазавод.** Твар сельска-гаспадарчай вытворчасьці ператварыўся: такія культуры, як сён і бульба, выцясьняюць ніяківа, экстэнсыўныя культуры.

Мы дабіліся такіх посьпехаў у бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам, у барацьбе з усялякімі адхіленьнямі ад лініі партыі.

Пуск **Чапляінскага** трактарнага заводу, **Бобрыкаў**, Беламорскі канал — цуда сусьветнай тэхнікі, харкаўскага турбінага заводу, рост здабычы чыгуну і сталі, вугалю і нафты — вось перамога генэральнай лініі нашай партыі, перамога ленінска-сталінскага кіраўніцтва нашай партыяй, нашай краінай. (Апляўдысмэнты).

Мы маем нячуваны творчы энтузіязм, самаахвярны гераізм шырокіх мас рабочых і калгаснікаў, нячуванае давер'е і адданасьць партыі Леніна. Правядзень не падлоскі на пазыку «першага году другой пяцігодкі» ў надзвычай кароткі тэрмін — яркі доказ гэтага.

У адным са сваіх выступленьняў тав. Сталін паставіў перад усімі намі задачу—**так змагацца, так працаваць, каб гэты год быў апошнім годам труднасьцяй. На выкананьні гэтай задачы мы павінны сканцэнтраваць усе свае сілы.**

Наша савецкая краіна—адна шостая зямной кулі—яшчэ, працуе і змагаецца ў капіталістычным акружэньні. Ідзе настаўнная барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць паміж сацыялістычным і капіталістычным сьветам.

НАША ПАЛІТЫКА, ПАЛІТЫКА МІРУ, ЯНА ГРУНТУЕЦЦА НА НАШАЙ СІЛЕ

СССР—сусьветны цэнтр камуністычнай рэвалюцыі. (Апляўдысмэнты). Капіталістычны сьвет перажывае нячуваны ў гісторыі эканамічны крызіс, які расхіствае, разьбівае пазоры капіталізму. Капіталізм развальваецца, як картачны домік, крызіс вядзе да новых войнаў і рэвалюцый.

Капіталізм адкінут назад на 50 год. Мартэны, капальні, горны, дэмны, нафтавыя прамысьлы бязьдзейнічаюць. Больш 60 мільёнаў рабочых без працы, асуджаны на голад і холад. Масавая прастытуцыя, вымаранье — вось у якіх тунік завёў капіталізм народы сваіх краёў.

Капіталістычная сыстэма трапчыць па ўсіх швах, развал сусьветнага капіталістычнага гандлю, фінансавы крах. Лопнуў даляр, ангельскі фунт стэрлінгаў, буйнейшыя банкі. Ніякага давер'я вялізе да другога. Для таго, каб выратаваць ад крызісу, капіталісты абвясьцілі нахід супроць тэхнікі, новых машын і навукі. Вось прычоскасьці разьбітай капіталістычнай гаспадаркі.

Адна галіна прамысловасьці расьце і буйна разьвіваецца. Гэта васенная прамысловасьць. Чэха-славацкія заводы — Шкода, францускія — Шнайдэр-Крэво, нямецкія — Крупа ніграбляюць і штомінутна вылазіваюць вялізарную колькасьць сьмертаноснай зброі.

Капіталістычны сьвет шукае выхаду ў новай сусьветнай вайне. Супярэчнасьці паміж капіталістычнымі краінамі, паміж Амэрыкай і Японіяй, Англіяй і Амэрыкай, Францыяй і Германіяй могуць прывесьці ў любы час да новай вайны. Нашы зарубежныя браты і сёстры на кляве павінны так працаваць, павінны весьці такую жэнію барацьбы, каб вайну імпэрыялістычную, калі яна пачнецца, ператварыць у вайну грамадзянскую, супроць імпэрыялістаў, супроць капіталістаў. (Апляўдысмэнты).

XII пленум Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу ў сваіх пастановах адзначыў, што капіталістычны сьвет упоўнае ў новую эпоху новых войнаў і пралетарскіх рэвалюцый. Капіталістычны сьвет шукае выхаду, у першую чаргу, на шляхох новай антысавецкай вайны. Гітлераўскія каты, падпальшчыкі хочуць адарваць ад СССР Украіну, Беларусь, ператварыць Савецкі саюз у калёнію. **Наш Савецкі саюз, калі гэтыя шуты і каты адважацца працягнуць сваю брудную лапу да нашых межаў, дасьць належны адказ. Ён здолеў гэту брудную лапу.** (Апляўдысмэнты).

Наша краіна, наша партыя, пад кіраўніцтвам лепшага паплечніка Леніна, правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіна (апляўдысмэнты) цьвёрда і ўпэўнена праводзіць палітыку міру, берэжэ нашу калгасную працу. Мы, рабочыя, калгаснікі, павінны штогадзіны, штомінутны ўмацоўваць абароназдольнасьць нашай краіны, магутнасьць нашай гераічнай непераможнай, любімай Чырвонай армії (апляўдысмэнты).

Мы вялі, вядзем і будзем весьці нашу палітыку міру, як вучыць нас наш вялікі правадыр і настаўнік тав. Сталін: «ні аднай пядзі чужой зямлі ня хочам, але сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому». (Апляўдысмэнты). Калі-ж Гітлеры, Розэнбэрґі і да іх падобная шваль зухочуць пасеяць васенны вецер, яны пажнуць такую рэвалюцыйную буру, якая зьмяце іх з твару зямлі (апляўдысмэнты).

Наша палітыка міру грунтуецца на нашай сіле. Гісторыя працуе за нас. Кожны дзень, кожная гадзіна робіць усё больш магутным, недатыкальным наш савецкі саўтасна-калгасны лад. Захоўваць непакіснасьць, недатыкальнасьць савецкіх рублёў — адна з найпершых вымогаў калгаснікаў (апляўдысмэнты).

У Лёндане засядае зараз сусьветная эканамічная канфэрэнцыя. Прадстаўнікі капіталістычных краін шукаюць лекара для здыхаючага капіталізму, але лекара яны ня знойдуць.

У гэтай канфэрэнцыі алтыўны ўдзел прымае і наша савецкая дэлегацыя. Яна атрымлівае адну перамогу за другой. Лёрды хацелі паставіць у часе працэсу шкоднікаў на электрастанцыях нашу краіну на калені, забараніўшы ўвоз нашых тавараў у Англію. Мы забаранілі ўвоз іх тавараў да нас. Мы ня ўступілі ні на адну пядзіну. **Англійскія лёрды прапхнуліся (зноўм Савецкага саюзу ня возьмеш!), яны вымушаны былі аказаваць забарону і тым самым расьпісаліся ў сваёй поўным банкрутстве.**

Другая буйная перамога — падпісаньне згоды аб агрэсыўнай нападаючага боку адзіна прымежнымі з намі дзяржавамі. Да гэтай згоды далучыліся і краіны Малой Антанты — Юга-Славія і Чэха-Славакія.

Хіба гэта ня буйнейшы трыумф нашай мірнай палітыкі, трыумф генэральнай лініі партыі, трыумф яе ленінскага кіраўніцтва на чале з тав. Сталіным. (Апляўдысмэнты).

Што было-б з намі, калі-б мы хоць крыху паслухалі правых апартуністаў, трацкістаў? Хіба мы мелі-б такія дасягненьні ў міжнародным становішчы і ўнутры нашай краіны?

На фоне бездзейнасьці, бязьвыходнасьці сусьветнага капіталізму, асаблівага яркія і прыкмецныя нашы дасягненьні, якія зьдзіўляюцца перамогай генэральнай лініі нашай партыі, рэзультатам давер'я найшырэйшых мас працоўных да ленінскай партыі, да не правадыра тав. Сталіна.

Адзіны шлях, які вядзе да зьнішчэньня крызісу, голаду, войнаў, — шлях непераўзойдзенай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Па гэтым шляху павінны ісьці нашы зарубежныя браты. Як не прасьледуюць капіталісты нашых братоў па клясе, але ня ўнікнуць ім свай лёс.

КАЛГАСНЫ ЛАД ЗАМАЦОВАН КАНЧАТКОВА І БЕСПАВАРОТНА

Калгасны лад зацьверджан канчаткова і беспаваротна. Калгаснік стаў апорай савецкай улады, непахісной мацнейшай апорай.

Вынікі сяўбы гэтага году паказваюць, што калгасны лад канчаткова ўмацаваўся, што ён адкрывае нам новыя магчымасьці для новага росту прадукцыйных сіл у нашай краіне. Пафас і энтузіязм калгасных мас ператварылі, як гаварыў тав. Сталін, «працу з ганебнага і цяжкага ярма, якою яна лічылася раней, у справу славы, справу адвагі і гэроізму». Сацыялістычнае спаборніцтва ахапіла найшырэйшыя масы рабочых і калгаснікаў.

Мы маем у сувязі з нашымі перамогамі і посьпехамі зьмену тактыкі клясавага ворага. Клясавы вораг разгромлен, але недабіт. Асуджанасьць, бязьвыходнасьць штурхаюць яго на новыя авантуры. Яго злосьць становіцца больш воспрай, нянавісьць больш палкай. Кулак зьмяняе сваю тактыку, манэўры, зварачаецца да новых прыёмаў. Замест лабавой атакі, ён лезе ў саветы, калгасы, ціхай сапай прабуе падарваць наш савецкі лад.

У нас нямала такіх гора-камуністаў, якія як гаварыў т. Сталін, якія «не заўважаючы клясавага ворага ў яго новай масцы і ня ўмеючы выкрываць яго мапэнцыцкіх малінаўцаў..., нарэдка супакойваюць сябе тым, што кулакоў ужо няма, нібыта, на сьвеце, што антысавецкія элементы ў вёсцы ужо зьнішчаны ў рэзультаце палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы і што можна памірыцца ў сувязі з гэтым з існаваньнем вэйтральных калгасаў, якія не зьяўляюцца ні большавіцкімі, ні антысавецкімі, але якія самі, так сказаць, стыхійным парадкам павінны будуць перайсьці на бок савецкай улады».

Гэта вядома, далёка ня так. Кулак у нас разьбіт, але яшчэ далёка не зьведзен. Ён ня ўзьлёс за іх сур'ёзна. Усіх худасочных коняй забараню-запрагаць і паставіў іх на круглаўзапчны адкорм, зьмяніў двух дзюжных конюхаў і да вясны коні былі падрыхтаваны.

У брыгадах я растлумачыў пастанову вьезду, расказаў, як павінен ударнік змагацца за сяўбу, і мая работа не запінула марна. Выкінулі з калгасу лодыраў Маостыку Мікалая, Стрэлкова Сяргея. Выходзіць на работу пачалі замест 7 у 3 гадзіны, працавалі да цёмнага.

Мяне ячэйка паслала на курорт, як ударніка, але я не паеду. Непатрэбны мне курорты (патрэбны і курорты, тав. Раўкоў!), — аддам усё сваё жыцьцё за нашу вялікую справу. Ад свайго пляну я не адступаю, буду змагацца за тое, каб наш калгас працаваў сапраўды бальшавіцкім, а калгаснікі заможнымі».

Вось ударнік, вось змагар за ўмацаваньне калгаснага ладу. Прывітаньне тав. Раўкову. (Апляўдысмэнты).

Калгасьніца «Калгасу «Новы сьвет», Міхалеўскага сельсавету, Рабінкова прадавала ў часе пасеўнай кампаніі без аднаго прапуску. Пасьля скончэньня сяўбы ў калгасе яна ўвашла ў букорную брыгаду для аказаньня дапамогі калгасу «Сілач», Должанскага сельсавету. Пад яе ўплывам падтрымаліся калгаснікі і калгасьніцы «Сілача». Вось Сурганаў Анісім, стары ўдарнік. Прымае актыўны ўдзел у абгаварэньні ўсіх пытаньняў работы калгасу. Быў дэлегатам 1-га раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў. Цяпер дэлегат 2-га зьлёту. У ча се пасеўнай кампаніі працаваў сістэматычна перавышаў норму: заслаў ручным способам жыта 5 га ў дзень пры норме ў 2,5 га.

Прывітаньне т. т. Рабінковай і Сурганаву. (Апляўдысмэнты).

Брыгада Шылова ў калгасе імя Сталіна, Машканскага сельсавету, першая ў калгасе і сельсавеце завяршыла веснавую сяўбу, выпрацаўшы перавышэньне ў сацпаборніцтве з брыгадай Люцкага.

Лепшымі ўдарнікамі ў часе сяўбы былі Шпакоў Сьцяпан — дэлегат 1-га раённага зьлёту калгаснікаў (Шпакоў з запі: я тут). Працаваў сяўбітам, перавыконваў нормы, ні разу не дапусьціў прасевах; Шпакова Марыя (Шпакова з запі: я тут) на многа перавышала нормы выпрацоўкі пры пасадцы бульбы.

Прыкладаў можна прывесьці яшчэ многа. Расьце і шырыцца армія ўдарнікаў сацыялістычнай працы, армія будаўнікоў новага калгаснага жыцьця.

РАСЬЦЕ І ШЫРЫЦЦА АРМІЯ УДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

І ў Віцебскім раёне ёсьць, будуць множыцца і расьці ўзоры перадавікоў, барацьбітоў за новую сацыялістычную вёску, якім мы перадаем сёньня наша палкае бальшавіцкае прывітаньне.

Вось да прыкладу калгаснік калгасу імя Чырвонай армії, Клатніцкага сельсавету, тав. Раўкоў.

Тав. Раўкоў піша ў газэце: «Я адзін з усіх калгаснікаў Віцебшчыны апрымаў гашаровае права прымаць удзел ад імя Віцебшчыны на Усесаюзным зьезде калгасьнікаў-ударнікаў. Пасьля зьезду я даў сабе слова, што ўсе тыя абавязацельствы, якія прымалі мы ў сваёй адозьве, з гонарам выканаю. Мне ясна ўрозаліся ў памяць словы тав. Кагановіча, што з лодырам, кулаком трэба распраўляцца бязьлітосна, трэба яго выкінуць з калгасу для таго, каб ён не перашкаджаў будаваць новае жыцьцё.

І пасьля зьезду я раней за ўсё ўзяўся за ачыстку калгасу ад клясава-чужых элементаў, якіх было ў нас шмат. Так, Пашчыні — раскулачаны — сядзеў у калгасе, раскрадаў, шкодзіў і яго чамусьці трымалі. Трымалі і Крыжэвіча Прыгора — сына раскулачанага, лодыра і зрыўшчыка працоўнай дысцыпліны. Мне стала ясна, што гэтым людзям не па дарозе з намі, што іх трэба чысьціць з калгасу. На першым-жа пасяджэньні прачуленыя я рашуча паставіў пытаньне аб тым, каб з калгасу іх прагнаць, а за шкодніцтва аддаць пад суд.

Нашы коні да майго прыезду ледзь цягалі ногі. Я сказаў сабе: «Ну, Якаў, з такімі конькі далёка не заедзеш». І я ўзяўся за іх сур'ёзна. Усіх худасочных коняй забараню-запрагаць і паставіў іх на круглаўзапчны адкорм, зьмянілі двух дзюжных конюхаў і да вясны коні былі падрыхтаваны.

У брыгадах я растлумачыў пастанову вьезду, расказаў, як павінен ударнік змагацца за сяўбу, і мая работа не запінула марна. Выкінулі з калгасу лодыраў Маостыку Мікалая, Стрэлкова Сяргея. Выходзіць на работу пачалі замест 7 у 3 гадзіны, працавалі да цёмнага.

Мяне ячэйка паслала на курорт, як ударніка, але я не паеду. Непатрэбны мне курорты (патрэбны і курорты, тав. Раўкоў!), — аддам усё сваё жыцьцё за нашу вялікую справу. Ад свайго пляну я не адступаю, буду змагацца за тое, каб наш калгас працаваў сапраўды бальшавіцкім, а калгаснікі заможнымі».

Вось ударнік, вось змагар за ўмацаваньне калгаснага ладу. Прывітаньне тав. Раўкову. (Апляўдысмэнты).

Калгасьніца «Калгасу «Новы сьвет», Міхалеўскага сельсавету, Рабінкова прадавала ў часе пасеўнай кампаніі без аднаго прапуску. Пасьля скончэньня сяўбы ў калгасе яна ўвашла ў букорную брыгаду для аказаньня дапамогі калгасу «Сілач», Должанскага сельсавету. Пад яе ўплывам падтрымаліся калгаснікі і калгасьніцы «Сілача». Вось Сурганаў Анісім, стары ўдарнік. Прымае актыўны ўдзел у абгаварэньні ўсіх пытаньняў работы калгасу. Быў дэлегатам 1-га раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў. Цяпер дэлегат 2-га зьлёту. У ча се пасеўнай кампаніі працаваў сістэматычна перавышаў норму: заслаў ручным способам жыта 5 га ў дзень пры норме ў 2,5 га.

Прывітаньне т. т. Рабінковай і Сурганаву. (Апляўдысмэнты).

Брыгада Шылова ў калгасе імя Сталіна, Машканскага сельсавету, першая ў калгасе і сельсавеце завяршыла веснавую сяўбу, выпрацаўшы перавышэньне ў сацпаборніцтве з брыгадай Люцкага.

Лепшымі ўдарнікамі ў часе сяўбы былі Шпакоў Сьцяпан — дэлегат 1-га раённага зьлёту калгаснікаў (Шпакоў з запі: я тут). Працаваў сяўбітам, перавыконваў нормы, ні разу не дапусьціў прасевах; Шпакова Марыя (Шпакова з запі: я тут) на многа перавышала нормы выпрацоўкі пры пасадцы бульбы.

Прыкладаў можна прывесьці яшчэ многа. Расьце і шырыцца армія ўдарнікаў сацыялістычнай працы, армія будаўнікоў новага калгаснага жыцьця.

ПРЫГВАЗЬДЗІЦЬ ДА ГАНЕБНАГА СЛУПА ЛОДЫРАЎ І ДАРМАЕДАЎ

Але мы маем у калгасах яшчэ шмат дармаедаў, буржуазна-кулацкіх прыслібальшчыкаў, лодыраў, зрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны. Барацьба з гэтымі прыслібальшчыкамі, лодырамі, падкулачальнікамі павінна весьціся штомінутна і бязьлітосна.

Вось прыклады адмоўнай работы.

Калгаснік брыгады № 1 калгасу «Новае жыцьцё», Скарасельскага сельсавету, камсамолец Сокалаў Ільля 20 мая на работу выйшаў толькі ў 6 гадзін 15 мінут. Прапрацаваўшы толькі гадзіну, ён адпрог каня, а сам прылёг спаць. У запуленай складанасьці рабочы час Сокалава за дзень склаў 7 гадзін 10 мінут, узараў ён 0,24 га.

У калгасе «Дырыжабль», Рудзяцкага сельсавету, вельмі слабая рабочая дысцыпліна. Дрэнна расстаўлена рабочая сіла. Так, брыгада «Камары» на 4 конях узарала толькі 0,25 га. У брыгадзе «Якупы» Калбасьнеў Павал, Міхалаева Матрона і Грышчанка Вусьціна 24 красавіка выпрацавалі толькі па 0,11 га на коня. Напыпадаюцца вялікія прагулы. На ралітніцы сьпяць, напрыклад, «радуніцу», брыгада «Камары» прагуляла паўдня, а за другую палову дня узарала на 6 конях 0,36 га. Юраваў бры гадай лодыр Пазноцкі, да гэтага аштрафаваны прагуленым калгасу на пяць працадзён.

А вось калгаснік калгасу імя Войкава, Рудзіцкага сельсавету, Вараб'ёў Якаў чатыры дні падрад ня выходзіў на работу. Яго брат Вараб'ёў Павал пры норме баранаваньня ў 4 га, забаранаваў за дзень 1 га. У разтар работы ён пакінуў коняй на полі нераспрэжанымі, а сам пашоў спаць.

Такіх гора-калгасьнікаў трэба бязьлітосна ганьбіць.

Мы маем рад прыкладаў агідных адносін да калгаснага каня, ня гледзячы на тое, што партыя і ўрад указвалі ня раз на неабходнасьць і важнасьць захаваньня і разьвіцьця конскага пагалоўя.

У брыгадзе «Паўлаічы» калгасу імя Чарвякова, Рудзяфоўскага сельсавету, конюхам быў Сініцкоў Лука. Коняй ён не даглядаў, ніколі іх ня чысьціў. Адпойчы Сініцкова паслалі па лякарства для хворага каня, а ён замест вэтпункту пашаў у краму Цэнтрасьпірту (у залі сьмех), напіўся, а лякарства ня прынёс. Каня ён прабаваў лячыць «лякарствамі», раздабытымі ў нейкай бабкі.

ЗАХОЎВАЦЬ КАЛГАСНУЮ МАЕМАСЬЦЬ, ЯК СВАЁ ВОКА

Ня гледзячы на тое, што тэхнічная база нашай сельскай гаспадаркі неймаверна вырасла, дзесяткі і дзесяткі тысяч трактараў працуюць на палёх нашага Савецкага саюзу, конь адыгрываў, адыгрывае і будзе адыгрываць вялікую ролю ў выкананьні ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній, асабліва ў часе ўборкі і загатовак. Трэба бязьлітосна выкрываць і самым строгім чынам караць кулакоў і падкулачнікаў, якія прабіраюцца на калгасную стайню, працягваюць сваю шкодніцкую руку да калгаснага каня. Трэба вылучаць конюхамі самых лепшых, праверэных калгаснікаў-ударнікаў, узьняць адказнасьць коня чага калгасьніка за стан прымацаванага да яго каня, дабіць кулацкую абязьлічку.

Берагчы, як вока, калгасную ўласнасьць. У той час, як у радзе калгасаў змагаюцца за ахову калгаснай маемасьці, ва многіх калгасах ідзе раскрадваньне калгаснага дабра.

Мы зрабілі многае, але зроблена яшчэ недаволі. Штогадзінна і штомінутна трэба адказваць над умацаваньнем калгасаў, над стварэньнем вядрад кіраўніцкоў і работнікаў калгаснага руху — старшынь калгасаў, брыгадзіраў, рахункаводаў, загадчыкаў фэрмаў. Трэба ўзьняць адказнасьць кожнага камуніста за кіраўніцтва калгасамі, стаяць на чале калгасаў праверэных, надзейных камуністаў і сумленных беспартыйных калгаснікаў. «Калгасы, — як гаварыў тав. Сталін, — як сацыялістычная форма арганізацыі гаспадаркі, могуць паказаць цуды гаспадарчага будаўніцтва, калі на чале іх стаюць сапраўдныя рэвалюцыянэры, бальшавікі, камуністы. І наадварот, — калгасы могуць ператварыцца на пэўны парыяд у прыкрыцьцё ўсякага роду контр-рэвалюцыйных дзеяньняў, калі ў калгасах будуць запраўляць эсэры і меншавікі, пятнікраўскія афіцэры і іншыя белагвардзейцы, былыя дзяржаўцы і калчакоўцы». Вось гэтых падлюк, вось гэту парэшную зграю трэба бязьлітосна выгнаць з калгасаў.

Нам трэба ўзяцца сур'ёзна за ўмацаваньне пастаянных вытворчых брыгадаў. Трэба, каб брыгада мела пастаянны вучастак зямлі, каб у брыгадзе была жалезная працоўная дысцыпліна, вытворчы плян, ліквідаваны праклятыя кулацкія ўраўнілаўка і абязьзлічка. Трэба павысіць прадукцыйнасьць працы, дабіць лодыра.

Мы маем у назапашаньні ўсё, каб ня толькі дагнаць, але і перагнаць, пакінуць далёка зазду самыя перадавыя капіталістычныя краіны. Для таго, каб умацаваць нашы калгасы, усталяць на неймаверную вышыню калгасную вытворчасьць, каб зрабіць багатым і заможным жыцьцё кожнага калгасніка, трэба ўстанавіць цьвёрдую дысцыпліну, быць пільным да клясавага ворага, біць па лодыру, прагульшчыку, разьбільдзяй. (Апляўдысмэнты).

Чаго мы патрабуем ад вас? «Ад вас,— гаварыў тав. Сталін на 1 усесаюзным зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў, — патрабуецца толькі адно: працаваць сумленна, дзяліць калгасныя даходы па працы, берагчы калгаснае дабро, берагчы трактары і машыны, устанавіць добры догляд каня, выконваць заданьні вашай рабоча-сялянскай дзяржавы, умацоўваць калгасы і выпыхаць вон з калгасаў пралезных туды кулакоў і падкулачнікаў». А для таго, «каб рухацца далей і канчаткова ўмацаваць калгасы, мы павінны зрабіць другі крок, мы павінны дабіцца новага дасягненьня. У чым заключацца гэты другі крок? Ён заключаецца ў тым, каб узьняць калгаснікаў — і былых бедняко ў, і былых сярэдняко ў — яшчэ вышэй. Ён заключаецца ў тым, каб зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі». Вось як стаіў пытаньне наш любімейшы правадыр т. Сталін (Бурныя апляўдысмэнты).

Калі мы будзем працаваць па-гаспадарску, берагчы калгаснае дабро, будзем змагацца з лодырамі, тады мы дабіемся такіх тэмпаў, перад якімі тэмпы першай пяцігодкі пакажуцца дзіцячай цацкай, такіх тэмпаў, якіх яшчэ сьвет ня бачыў.

ПА-БАЯВОМУ ПРАВЕСЬЦІ ПРАПОЛКУ, ПА-УДАРНАМУ АРГАНІЗАВАЦЬ УБОРКУ І ПАСТАЎКУ С.-Г. ПРАДУКТАЎ ДЗЯРЖАВЕ

Веснавая сяўба завершана. Але самае важнае і цяжкае ў вас упераадзе. Паглядзеце, што ў вас робіцца: папар яшчэ не зораны, праполка, на сорам Віцебскага раёну, ідзе вельмі марудна. Важнасьць праполкі і ворыва папару відавочна для кожнага з вас. Яны ва зноўм выражаюць лёс нашага сацыялістычнага ўраджаю.

Беларусь у значнай меры краіна жывёлагадоўчая. Сенакашэньне і сілаваньне маюць тут выключнае значэньне. Між тым, сенакашэньне разгортваецца ў вашым раёне слаба.

Падрыхтаваць да ўборачнай кампаніі гэта азначае падрыхтаваць кадры, краверыць і ўмацаваць пастаянныя вытворчыя брыгады, падрыхтаваць каня, збрую, сельска-гаспадарчы інвэнтар, поўнасьцю арганізаваць выкарыстаньне працы калгаснікаў, калгаснай моладзі. Трэба распрацаваць каляндарны плян, распрацаваць па прыкладзе прамысловых прадпрыемстваў штодзённы графік работы, памеціць, што, калі, у якія тэрміны, пры якіх затратах рабочай і прагавай сілы павінна быць выканана. Цэльга працаваць так, каб адна работа наскокавала на другую. Сёньня ня выкінаем, заўтра выканаць за абодны дні будзе цяжэй.

Пасьпяхова правесьці ўборку азначае правесьці яе ў тэрмін, ударнымі кампаніямі. Нельга дапусьціць, каб збожжа прастоіла лішні дзень, нельга дапусьціць, каб уборка ішла са стратамі. Вучоныя вылічылі, што наша краіна ад страт пры ўборцы ўраджаю штогодна траціць да 500 млн. пудоў збожжа. Гэта ня жарты. Трэба змагацца за кожны колас, за тое, каб захаваць кожнае зерне нашага сацыялістычнага ўраджаю.

Перад вамі, таварышы-ударнікі, стаіць вялікай важнасьці задача — у тэрмін і поўнасьцю выканаць свае абавязацельствы па пастаўцы і здачы сельска-гаспадарчай прадукцыі дзяржаве. У працэсе ўборкі трэба неадкладна арганізаваць малацьбу і збожжаадачу. Выканаць свае абавязацельствы перад дзяржавай — гэта першая запавядь кожнага калгасніка і працоўнага аднасобніка. Загатовкі трэба арганізаваць, тут нельга спадзявацца на самацёк. Трэба даць бязьлітосны адпор спробам кулака і падкулачніка сарваць загатоўкі. Бязьлітосна біце на кулаку. Віцебскі раён павінен, улічваючы ўрокі весьнавой сяўбы, дабіцца аднаго з перадавых месц у загатоўчай кампаніі, у барацьбе за ўраджай.

А віды на ўраджай у вас добрыя. Вось пост брыгадзіра калгасу Замасточча, Замастоцкага сельсавету тав. Гусакова — дэлегата вашага зьлёту. Тут тав. Гусакоў? (Гусакоў з запі: я тут).

Вось што ён піша: «Сказаць па праўдзе, ужо пяць год ня бачыл такога ўраджаю, як зараз на палёх нашага калгасу. Прыдзеш у поле і радуешся і лёгка на сэрцы становіцца, адчуваеш, што твая работа дарма не прапала. Радуешся, гледзячы на высокае густое жыта, на буйныя і чыстыя аўсы, ячмяні і лён, на густую віку і гарох. Так, папрацавалі, але затое і ўраджай проста ўкраінскі і сымела ручаюся, што пашукайце ў любым калгасе сельсавету, ня знойдзеце такога добрага збожжа, такой чыстай і густой бульбы, як наша. З хлебам будзем, засыпемся бульбай, будзем заможнымі, дзяржаве ў першую чаргу накіруем абозы збожжа і бульбы, раней тэрміну выканаем наш сьвяты доўг». Малайчына, тав. Гусакоў! (Апляўдысмэнты).

«Трывожыць,—піша далей тав. Гусакоў, — мяне адно: пасеяць то мы пасеялі добра, збожжа думаем атрымаць ня менш 3 клгр. на працадзень, але ўраджай заваёўваецца ня толькі вясной, а і ў часе ўборкі і малацьбы. І на гэтым шляху стаюць новыя вялікія труднасьці. Я ўпэўнен, што чорным груганьнём нялюдзі кулакі, злодзеі, жулікі, якія папрабуюць працягнуць сваю руку да нашага ўраджаю (вось клясава-шкільны чалавек), яе дамо, рукі адсячу, ні аднаго зерня, ні адной бульбіны ў нас не прападзе. Будзем пільна ахоўваць свой ураджай ад усякіх прошукаў клясавага ворага, паставім жалезную ахову, бо ахова і ўлік ураджаю — самае галоўнае».

Малайчына, тав. Гусакоў! Прывітаньне такому ўдарніку! (Бурныя апляўдысмэнты).

Для таго, каб забраць увесь ураджай, каб своячасова і поўнасьцю выканаць свае абавязацельствы перад дзяржавай, трэба арганізаваць сапраўды жалезную ахову сацыялістычнага ўраджаю ад клясавага ворага — кулака і яго дапаможніка. Трэба, каб кожны калгаснік адказваў і змагаўся за ахову ўраджаю. Трэба, каб кожны калгаснік праяўляўся сьвядомасьцю таго, што ад аховы ўраджаю залежыць і выкананьне калгасам яго абавязацельстваў перад дзяржавай і яго асабісты, калгасьні

Аб ходзе праполкі і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі ў МТС

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ Бел.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Калегія НК РСІ Бел. адзначаюць, што падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі ў МТС, як паказвае праведзенае абследаванне і нарада пры ЦКК РСІ-праходзіць вусім нездавальняюча.

Апараты як Трактарацэнтраў, так і большасці МТС—не перабудаваліся сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі, пастаўленымі ЦК і СНК СССР у іх пастановах аб усялякіх папараў, арганізацыі ўборкі зернавых і правядзеньні іншых работ.

Да 5 ліпеня планы ўборачнай кампаніі з Трактарацэнтраў ня спушчаны і рабочыя планы ў МТС і калгасах ня складзены.

Да рамонту трактароў у МТС, Трактарацэнтры і гародня-бульбяным Трактарацэнтры фактычна не прыступлена—адрамантавана ў Ільнатрактарацэнтры 6 трактароў з падлягаючых рамонту 332 шт., у гародня-бульбяным Трактарацэнтры — дакладныя весткі адсутнічаюць; у сыстэме Зернятрактарацэнтру адрамантавана 73 проц. (231 шт.) трактараў, аднак, некаторыя МТС (Бягомльская, Лагойская, Плешчаніцкая) да рамонту не прыступілі, а якасьць рамонту ў астатніх МТС не праверана.

Рамонт уборачных машын, асабліва ў калгасах, абслугоўваемых МТС, праходзіць кепска. Па калгасах МТС гародня-бульбянога Трактарацэнтру адрамантавана жнеяк 71 проц., малатарнях складаных 28 проц., малатарнях конных — 68 проц., сенакасілак — 85 проц. Па Ільнатрактарацэнтру — снопавязалак — 73 проц., жаткак 58 проц., ільнацерабілак — 69 проц., малатарняў складаных — 18 проц., малатарняў Эдзі — 66 проц.

Плян падрыхтоўкі кадраў да ўборачнай выкапан у гародня-бульбяным Трактарацэнтры на 54 проц., Зернятрактарацэнтры—на 36 проц., у ільнатрактарацэнтры — фактычна не прыступлена.

Да 1-VII па МТС гародня-бульбянога Трактарацэнтру ўзьнята папараў 72 проц., прапоната гародаў 55 проц., зернавых—50 проц., бульбы—24 проц., сюшана 1,5 проц., поліву лёна 45 проц., сенакашэньня 0,08 проц.

Рад МТС—Пуцчынская, Бальшавіцкая, Буда-Кашалёўская, Жлобінская (гар.-бульбян. Трактарацэнтр), Бягомльская, Лагойская, Плешчаніцкая (зернавы Трактарацэнтр), Чашніцкая (ільнатрактарацэнтр)—на выжаканьні гэтых работ знаходзіцца ў глыбокім прарыве.

Такая работа стварае сур'ёзную пагрозу ва ўборцы зернавых, калгасавых і абмалоту.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Бел. цастанаўляюць:

1. Нам. начальніку і загадчыку выт ворча-плянавага сэктару Ільнатрактарацэнтру т. Селіванаву за зрыў рамонту трактароў, падрыхтоўкі кадраў, за невыкананьне плянаў па прапашна-праполачных работах—абвясьціць суровую вымову.

2. Начальніку гародня-бульбянога Трактарацэнтру тав. Грабенчыку за бязьдзейнасьць, адсутнасьць жывога кіраўніцтва ў арганізацыі праполкі і прапашкі, сенакашэньня, ворыву папараў, за неарганізацыю вучоту рамонту тракатараў і с.-гг. машын, за дапушчэньне зрыву падрыхтоўкі кадраў да ўборачнай кампаніі—абвясьціць вымову.

3. Начальніка сэктару кадраў гародня-бульбянога Трактарацэнтру тав. Жданоўча, не прыняўшага ніякіх мер да ўкамплектаваньня і наладжваньня нармальнай работы курсаў па падрыхтоўцы кадраў—трактарыстаў, машыністаў, вагаўшчыкоў і інш.—на працягу ўсяго чэрвеня месяца і абмежаваўшагося дасылкай МТС трох тэлеграм у канцы чэрвеня (25, 28, 30), атрымаўшага спагнаньне ад ЦКК за бязьдзейнасьць у падрыхтоўцы кадраў да веснавой сяўбы—з працы зьняць.

4. Начальніку кіраўніцтва расьлінаводзтва НКЗ—тав. Бярэжкаму за правялены бюракратызм і спазьненьне ў складаньні пляну прапашна-праполачных работ, давядзеньне яго да трактарацэнтраў і раёнаў толькі ў канцы чэрвеня, што садзейнічала зрыву гэтых работ—абвясьціць суровую вымову.

5. За зрыў работы па рамонту трактараў, невыкананьне ў тэрмін пляну ворыва папараў, прапашкі і праполкі, а кепскую арганізацыю падрыхтоўкі да ўборачнай дырэктарам МТС—Зернятрактарацэнтру — Лагойскай—тав. Зіньковічу, Бягомльскай — тав. Буйнаву, Плешчаніцкай — тав. Міхайлаву; гародня-бульбянога Трактарацэнтру — Бальшавіцкай — тав. Калядзе, Пуцчынскай—тав. Маеву, Буда-Кашалёўскай — тав. Жалезьнякову — абвясьціць вымову. Папярэдзіць іх аб тым, што яны будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці, калі ў рабоце іх МТС ня будзе адпаведнага пералому.

6. Прыняць да ведама, што дырэктар Чашніцкай МТС тав. Сахно за зрыў праполачнай і падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі прыцягнут да партыйнай адказнасьці Чашніцкай КК РСІ і што загадчык Чашніцкага райза Гудзянка—член партыі з 1928 году—за бязьдзейнасьць у справе падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі выключан з партыі.

7. Прапанаваць Менскай ГарКК, Дзяржынскай, Буда-Кашалёўскай, Жлобінскай, Бягомльскай, Лагойскай, Плешчаніцкай РКК-РСІ арганізаваць па паказаных МТС пасты РСІ на чале з яленамі прэзыдыуму ЦК для сыстэматычнага сталага кантролю за работай гэтых МТС. Не пазьней 15 ліпеня абгаварыць на пасяджаньні прэзыдыуму работу паказаных МТС і аб выніках паведаміць ЦКК.

8. Абавязаць Касьцюковіцкую РКК-РСІ тэрміново праверыць прычыны недапушчальнага чвякага скарыстаньня трактароў Касьцюковіцкай МТС на восьце папараў, прыняць на месцы меры па пасьпяшэньні трактараскарыстаньня і аб выніках паведаміць ЦКК да 15 ліпеня.

9. Прапанаваць т. т. Грабенчыку, Дубоўскаму і Селіванаву выслаць у МТС, у першую чаргу арсталоўкі, па 15 работнікаў з апарату трактарацэнтраў для дапамогі дырэктарам у ліквідацыі зрываў на праполачнай, апрацоўцы папараў і ў арганізацыі падрыхтоўкі і правядзеньня ўборкі.

10. Прапанаваць дырэктарам МТС у дакадны тэрмін правесьці дакладны ўлік жнівярак і іншых уборачных машын, іх расстаноўкі і напрузку па калгасах і ў адпаведнасьці з гэтым расставіць машыны МТС. Зараз-жа вылучыць лепшы сталы склад работнікаў (машыністаў, вязальшчыкаў і інш.) і коней для кожнай машыны на ўвесь перыяд работы, давёўшы да іх адпаведную напрузку, выходзячы з выт ворчай магутнасьці машын.

11. Абавязаць тав. Грабенчыка ў 2-х дакадны тэрмін выслаць у Бальшавіцкую МТС адказнага работніка Трактарацэнтру для арганізацыі працы і расстаноўкі сродкаў вытворчасьці на час уборкі ў калгасах, абслугоўваемых МТС.

12. Прапанаваць НКЗему ўмацаваць Бальшавіцкую і Пуцчынскую МТС кадрамі апаратаў для работы на вытворчых вучастках МТС.

Кандыдаты на прэміяваньне па ўсебеларускім спаборніцтве за лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

Ніжэй друкуецца сьпіс кандыдатаў—перадавых ударнікаў: рабочых саўгасаў, брыгадзіраў калгасаў, калгасьнікаў і лепшых перадавых працоўных адпаасобнікаў.

Працяг гл. у № 149.

67. Аляксейчык — калгасьнік-ударнік калгасу імя Дзяржынскага, Рэчыцкага раёну.

68. Здаровец Рыгор—брыгадзір-ударнік, Брагінскага раёну.

69. Краўчанка — калгасьніца Брагінскага раёну.

70. Вутаёў — брыгадзір-ударнік калгасу імя Сталіна, Чэрыкаўскага раёну.

71. Гуралноў — калгасьнік-ударнік калгасу «Іскра», Чэрыкаўскага раёну.

72. Дзямідава — калгасьніца-ударніца калгасу імя Варапышава, Чэрыкаўскага раёну.

73. Пілішенка Гаўрыла — брыгадзір калгасу «Зьвязда», Мазырскага раёну.

74. Качан Прося — заг. сьвінаводчай фэрмы «Новыя Даманавічы», Мазырскага раёну.

75. Якуш Пётра — брыгадзір калгасу «Камінтэрн», Мазырскага раёну.

76. Ваброў Лявон — калгасьнік-ударнік калгасу імя Варапышава, Мазырскага раёну.

77. Якуш Аксіньня — калгасьніца-ударніца калгасу «Чырвоны араты», Мазырскага раёну.

78. Яруш — калгасьнік-ударнік, Ельскага раёну.

79. Сінгарчук — брыгадзір-ударнік Ельскага раёну.

80. Рамановіч Антон — ударнік калгасу імя Варапышава, Ельскага раёну.

81. Крушко Рыгор Васільеў — калгасьнік-ударнік калгасу «Прагрэс», Жытковіцкага раёну.

82. Макаровіч Аксіньня Сьцяпанава—калгасьніца-ударніца, Жытковіцкага раёну.

83. Канамацкі Сьцяпан Гаўрылаў — брыгадзір ударнік калгасу «Чырвоны Прымежнік», Жытковіцкага раёну.

84. Шапранская Хадосься — камунарка камуны «Індустрыялізацыя», Сеньненскага раёну.

85. Бароўскі—брыгадзір-ударнік калгасу імя 1 мая, Лагойскага раёну.

86. Сьмярнюк — брыгадзір-ударнік калгасу «Бальшавік», Лагойскага раёну.

87. Рыбчан—калгасьнік ударнік калгасу «Новачайка», Лагойскага раёну.

88. Рудзькевіч — калгасьнік-ударнік калгасу імя Будзённага, Лагойскага раёну.

89. Чаркова Кацярына — калгасьніца-ударніца калгасу імя Сталіна, Полацкага раёну.

90. Крупскі Павел — калгасьнік ударнік калгасу імя Молатава, Полацкага раёну.

91. Блепчык Пётра Пятроў — брыгадзір калгасу «Перамога», Смалявіцкага раёну.

92. Нарвін Рыгор — брыгадзір калгасу «16 партызьезд», Талачынскага раёну.

93. Чэробка Раман — брыгадзір, Асіпавіцкага раёну.

94. Татур Язэп Адамаў — брыгадзір Асіпавіцкага раёну.

95. Шлапак Сідар — брыгадзір калгасу «Чырвоны Араты», Камарынскага раёну.

96. Кавальчук Яўхім — брыгадзір калгасу «Чырвоны будаўнік», Камарынскага раёну.

97. Васілеўскі — брыгадзір калгасу імя Калініна, Вузьдзенскага раёну.

98. Бісюкоў Яўхім — брыгадзір калгасу «Чырвоны сьцяг», Вузьдзенскага раёну.

99. Махнач Кастусь — брыгадзір калгасу «Чырвоны Кастрычнік», Вузьдзенскага раёну.

100. Стралкоўская В. М. — брыгадзір Барысаўскага раёну, калгасу «Чырвоная зорка».

101. Дрындзік Піліп Самёнаў — брыгадзір-ударнік калгасу «Камінтэрн», Старадароскага раёну.

102. Коркуць Кастусь Рыгораў —брыгадзір калгасу «Чырвоны змагар», Нараўлянскага раёну.

103. Кавальчук Іван Хведараў —калгасьнік калгасу «Новае жыцьцё», Акопскага сельсавету, Нараўлянскага раёну.

104. Рэдзька Прузына — калгасьніца ўдарніца калгасу імя ЦВК БССР, Пухавіцкага раёну.

105. Бардулёў Грышка — аднаасобнік вёскі Аржаўцаў, Шкловскага раёну.

106. Залеўская Ксеня Андрэева — калгасьніца калгасу «Орка», Смалявіцкага раёну.

107. Яраховіч Люба Язэпава — калгасьніца калгасу «Упярэд», Смалявіцкага раёну.

108. Драгун Варка Венідзіктаўна—калгасьніца калгасу імя Калініна, Смалявіцкага раёну.

109. Штабная Агрыпіна — калгасьніца калгасу імя Чарвякова, Камарынскага раёну.

110. Новікаў Нічыпар — калгасьнік калгасу «Інтэрнацыянал», Асіпавіцкага раёну.

111 Бобрык Хадосься — калгасьніца калгасу імя Гікало, Асіпавіцкага раёну.

112. Вінькава Марыля — калгасьніца калгасу «Чырвоная Рудня», Жлобінскага раёну.

113. Журнова Ганна — калгасьніца калгасу «Вольная праца», Жлобінскага раёну.

114. Хіровіч Гаруля — калгасьніца-ударніца Талачынскага раёну.

115. Цімашоў Хведар — калгасьнік калгасу імя Фрунзэ, Талачынскага раёну.

116. Гугоўскі Хведар — калгасьнік калгасу імя МОПР'а, Талачынскага раёну.

117. Калечыц Эміля — калгасьніца калгасу імя Пакроўскага, Дзяржынскага раёну.

118. Тарэйковіч Эміля — калгасьніца калгасу «Варацьбіт», Дзяржынскага раёну.

119. Касько Алена — калгасьніца калгасу «Камуна», Старадароскага раёну.

120. Шух Мікола — калгасьнік калгасу «Скварцова», Старадароскага раёну.

121. Ліўшыц Есіль — калгасьнік калгасу «Сацыялізм», Старадароскага раёну.

122. Гармоза Марыля — калгасьніца калгасу «Чырвоны пагранічнік», Дзяржынскага раёну.

123. Будай Тодар Цімохаў — калгасьнік калгасу «Камунар», Бягомльскага раёну.

124. Герасіменка Барыс — брыгадзір калгасу «Чырвоны баец», Бягомльскага раёну.

125. Малашэвич Вольга Міхасёва — калгасьніца калгасу «Расьсьвет», Вузьдзенскага раёну.

6. Рудаўская Ганька Піліпава — калгасьніца калгасу «Вальшавік», Вузьдзенскага раёну.

(Працяг будзе).

Пісьменьнікі—да 13-годзьдзя вызваленьня Беларусі

Да XIII гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў наладжваецца рад выездаў пісьменьнікаў на перыферыю, у часьці Чырвонай арміі. У Воршу выязджае брыгада ў складзе **І. Харыка, С. Шушкевіча, С. Нортмана** (разам з вакальным ансамблем Палонскага); ва Ўрэчча паедуць: **М. Хведаровіч, П. Броўка, П. Глебка, Ул. Хадыка, Ал. Кучар.**

**

Артысты БелДАМЭЦ т. т. **Бандарчык і Мцэнскі** рыхтуюць да XIII-годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў спэцыяльна напісаную драматычную рэч—«Дваццаты год». Тэкст **П. Глебкі**, пастаноўчык—**Н. А. Кавязін.**

Мардоўскія пісьменьнікі ў БССР

Для азнаямленьня з адным з буйнейшых прамысловых асяродкаў Савецкай Беларусі мардоўскія пісьменьнікі —т. т. **Іркаеў, Лукінаў і Лявонцеў** выязджалі 7 ліпеня ў гор. Барысаў. У Барысаве пісьменьнікі наведалі запалкавую фабрыку, завод імя тав. Домбаля, фанэрны завод, а таксама выехалі ў калгас «**Чырвоная зорка**».

Учора, 9 ліпеня, мардоўскія госьці наведалі Беларускую Акадэмію Навук і зрабілі выступленьне для рабочых бліжэйшых торфапрадпрыемстваў, дзе ў раз працуюць рабочыя-сэзонікі з Мардоўскай аўтаномнай вобласьці. Учора-ж увечары т. т. Іркаеў, Лукінаў і Лявонцеў выехалі назад у гор. Саранск.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

НК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 18,19 і 20 ліпеня г. г. у г. Бабруйску будзе працаваць партройка ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Бабруйскага, Глускага і Парыцкага раёнаў.

Выклікаюцца наступныя таварышы:

На 13-VII-33 г.

Лапкоўскі А. С., Левін С. С., Барысік Сьцяпан Н., Барысік Максім А., Пархоменка Гарасім Паўлаў — Глускі раён, Лобаз П. П., Дворнік А., Мітрафанаў Е., Дзячэнка К. М.—Парыцкі раён.

На 14-15-VII-33 г.

Эль Абрам Якаўлеў, Габрусь Васіль Захараў, Шмаргун Мікола Язэпаў, Ражаўскі Навум Саламонавіч, Шчэдрынскі А. М., Тынкоў Б. М., Лузанаў А. В., Ледэрман Э. М., Шмідт Г. О., Няпомняшчы, Кацнэльсон Ізраіль, Сладкавіч Н. Н., Гучко П. С., Апранін П. К. Сбатко Я. С., Ашаровіч С., Розэнбаум С. М., Вячэра С. П., Насковіч В. І., Клейнэр Ю. М., Нісьневіч Г. М., Цэхноўскі Г. С., Кацнэльсон Н. Э., Гнядзенко А. Н., Зубэр Л. Л., Бернштэйн Ф Ю., Панізовіч Е. П., Жураўлёў Б. Я., Кантаровіч С., Гелер І. В., Лявонаў А. І., Давідоўскі І., Мельнікаў С. А., Еўлаш М. Ц., Белякоў Н. С., Крукаў Ф. І., Паўлаў А. М., Кучынскі Рыг. М., Мазурык, Гайсенка.

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Да дня разгляду справы таварышоў неабходна прадставіць ПТ характарыстыкі ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

Член ПК ЦКК КП(б)Б СЬЦЯПНЯК.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

Гэрманскія фашысты „падрыхтоўваюць"

Працэс аб падпале рэйхстагу

БЭРЛІН, 8. (УЛАСН. КАР. «ЗЬВЯЗДЫ»). Газэты сьцьвярджаюць, што працэс супроць правакатара ВАН-ДЭР-ЛЮБЭ і т. т. ТОРГЛЕРА, ДЗІМІТРАВА, ТАНЕВА І ПАПОВА пачнецца ў жніўні месяці.

За апошні час агенты паліцыі Гэрынга прымаюць меры да інсцэніраваньня розных «знаходак выбуховых матэрый» і да вымыслу «дакумантаў», якія даказваюць «падрыхтоўку кампартыі да ўзброенага паўстаньня». Фашысцкая прэса ўся запоўнена гэтымі паведамленьнямі.

З мэтай дыскрэдытаваньня германскай кампартыі, бюро прапаганды нацыянал-сацыялісцкай партыі публікуе наступнае камунікэ: «Дзяржаўная паліцыя ў Дортмундзе ўдалося адкрыць у Гердэке, Швэрцы і Гагене тайную вельмі разгалінёную арганізацыю «Ротфронт». Затрыманы 45 чалавек, з якіх 35 арыштаваны. Сярод арыштаваных 3 рускай нацыянальнасьці.

Гэта тайная арганізацыя была забясьпечана ўсякага роду агнястрэльным аружжам, выбуховымі матэрыямі і бомбамі.

Сьледзтвам устаноўлена, што вясной 1933 г. намячалася арганізаваць узброенае паўстаньне і рэвалюцыю».

Усе гэтыя выдуманыя факты настолькі адпавядаюць мэтам і жаданьням нацыянал-сацыялістаў, што сумняваецца ў іх інжівасьці ня прыходзіцца.

Паведамленьні гэтнага роду паўтарэюцца кожны дзень: яны служаць толькі повадам для новых арыштаў.

Фашысцкі ўрад імкнецца да таго, каб працэс адкрыўся ў атмасфэры тэрору.

Германскія блазны на эканамічнай канфэрэнцыі.

Востры канфлікт паміж Гітлерам і ваенным міністрам Блёмбэргам

БЭРЛІН 8 (Белта) «ФОЛЬКСШТЫММЕ», якая выдаецца ў СААРБРУКЕНЕ, паведамляе, што паміж ГІТЛЕРАМ І ГЕРМАНСКІМ ВАЕННЫМ МІНІСТРАМ БЛЁМБЭРГАМ УЗЬНІК КАНФЛІКТ у сувязі са спробамі нацыянал-сацыялістаў захапіць камандныя пасты ў арміі шляхам замены старых ваенных кіраўнікоў членамі нацыянал-сацыялісцкай партыі. Канфлікт абастрыўся ў сувязі з прызывам на перападрыхтоўку пяці тысяч пяцісот армейскіх і трохсот пяцідзесяці морскіх афіцэраў. Згодна патрабаваньня Гітлера, прызваныя праходзілі палітычную камісію, якая складалася з нацыянал-сацыялістаў. Блёмбэрг забраняваў больш трох чвэртак кандыдатаў, высунутых палітыкамісіяй і напе жачых да нацыянал-сацыялісцкай партыі, і ў пісьце да Гіндэнбурга пратэставаў супроць палітычнага адбору афіцэраў. Паводле слоў газэт, БЛЁМБЭРГ ЗНАХОДЗІЦЬ ПАДТРЫМАНЬНЕ Ў ГІНДЭНБУРГА І НЕКАТОРЫХ ЧЛЕНАЎ ГАБІНЭТА ГІТЛЕРА.

Хваляваньні сярод штурмавікоў узмацняюцца

Гітлер пагражае недавольным рэпрэсыямі

ЛЁНДАН, 8 (ТАСС). Друк паведамляе, што ГІТЛЕР перад нацыянал-сацыялісцкімі лідэрамі ў РЭЙХЕНТЭЛЬЛЕ заявіў, што ён «намерэн бязьлітасна задушыць усякія спробы сваіх прыхільнікаў выступіць супроць цяперашняга курсу нацыянал-сацыялісцкага ўраду і што з працаўнікамі гэтага курсу «будзе абыходзіцца сурова, якое-б становішча яны не займалі».

Агэнцтва «РЭЙТАР» падкрэсьлівае, што папярэджаньне Гітлера зьвязана З НЕЗАДАВАЛЬНЕНЬНЕМ І ХВАЛЯВАНЬНЯМІ СЯРОД ШТУРМАВІКОЎ.

Замежная хроніка

* Сёньня ў СССР выязджаюць турэцкія спартсмэны на чале са старшынёй Стамбульскай арганізацыі народнай партыі Джэўдэт Керым.

* Англа-савецкія перамовы аб заключэньні новай гандлёвай згоды будуць адноўлены 10 ліпеня.

* 7 ліпеня з Кобэ ў Манчжурыю выехала чарговая група «ўзброеных японскіх эмігрантаў» у складзе 500 рэзервістаў, прайшоўшых перад ад'ездам ваеннае навучаньне.

* Забастоўка рабочых шоўкавых фабрык у Шанхаі ахоплівае новыя слаі рабочых. У сучасны момант бастуе звыш 10.000 рабочых на 39-ці фабрыках. Кітайскія ўлады сумесна з Гаміндана ўскімі прафсаюзамі прабуюць выступіць у якасьці пасрэднікаў паміж прадпрыемцамі і бастуючымі.

Справа шкодніцкай грамадзкага харчаваньня на Маскоўскім заводзе імя Фрунзэ і ў ЦІА

МАСКВА, 9. (ТАСС). У Маскве пачалася слуханьнем справа групы шкоднікаў грамадзкага харчаваньня на заводзе імя Фрунзэ і цэнтральным інстытуце авіямотабудаўніцтва. Дзяржаўнае абвінавачаньне падтрымлівае пракурор гораду Масквы тав. Фінкеў. Абарона прадстаўлена членамі калегіі абаронцаў т. т. Камодевым, Казначэевым і Браўдэ.

Абвінаваўчае заключэньне малюе шкодніцкую дзейнасьць контрэвалюцыйнай шайкі, якая ўзначальвалася Ошкіным-Сьцяпанавым — былым афіцэрам царскай арміі, кулаком і гандлярам. Вінаватыя зьвязаны паміж сабой нацыяналістамі да савецкай улады і рабочай клясы, прадстаўляюць сабой агрэсыўнае разгромленага кулацтва. Клясавы вораг спрабуе ў розных спосабаў барацьбы: у ежу рабочым выпалі раздробленае шкло, цьвікі, дрот, запасы і г. д.

Не абмяжоўваючыся простым шкодніцтвам, зрывам рабочага снабжэньня, шкодніцкая група вяла контрэвалюцыйную агітацыю. Допыт цэнтральнай фігуры працэсу — падсудзнага Міхаіла Ошкіна-Сьцяпанава на судовым сьледзтве зьвязвае ў адно цэлае ўсе зьвены злачынстваў, якія рабіла пад яго кіраўніцтвам шкодніцкая група.

Ошкін скалачваў вакол сябе контрэвалюцыйную групу, арганізаваў крадзеж дакумантаў, якімі снабжаў кулакоў, што схаваліся ў Маскве, натхняў іх на актыўную барацьбу супроць савецкай улады. Адкуль-жа брала групы шкодніцкая група? Яна атрымлівала іх ад тэй-жа самай шкодніцкай дзейнасьці ў сталовых ад продажу пакрадзеных прадуктаў.

Група клясавых ворагаў, не спыняючыся ні перад чым, не пагарджала ніякімі сродкамі. У ходзе сьледзтва старшыня тав. Сьмірноў канчаткова выкрывае твар Ошкіна-Сьцяпанава, вялікшага ворага савецкай улады, які змагаўся з ёю ўсімі даступнымі сродкамі.

ПАБУДУЕМ АГІТСАМАЛЁТ „М. ГОРКІ"

Гутарка з нам. нач. ЦАГІ, гал. канструктарам агітсамалёта „Максім Горкі" А. М. Тупалевым

Першы ў Саюзе поўмэталёвы самалёт АНТ—1 мы, работнікі ЦАГІ, пабудавалі ў 1923 годзе. Ён выглядае пігмэем перад будучым «Максімам Горкім»—звышгігантам, роўнага якому няма ў сьвеце. Паміж двума гэтымі самалётамі ляжыць дзевяць год напружанай, творчай работы канструктарскага калектыву ЦАГІ. З параўнаньня гэтых дзьвёх машын лётка зразумець, як модна вырасла канструктарская авіяцыйная мысьль у нашым Саюзе. Несучая паверхня крыльляў «Максіма Горкага» будзе ў 40-60 раз больш несучай паверхні АНТ—1. А вага калёс нашага паветрапага вялікана будзе перавышаць вагу ўсяго самалёту АНТ—1. АНТ—1 можна фазам з маторам, шасі і вінтом зьмясьціць унутры крыла «Максіма Горкага».

Нэрвюры АНТ—1 зроблены з кальчуга-алюміня, таўшчынёй усяго 0,3-0,5 міліметра. А лонжэроны «Максіма Горкага» зроблены з магутных кальчуга-алюміневых труб, дыямэтрам 100-150 міліметраў. Гета ўжо непадобна да тонкага ўзорнага рысунку лонжэрону, а хутчэй нагадвае моцныя сталёвыя канструкцыі мосту.

«Максім Горкі» ня проста самалёт, а самалёт-мататар. І таму ўсё яго ўнутранае абсталяваньне і снаражэньне, уся кампаноўка ўнутраных памяшканьняў будуць падпарадкаваны асноўнаму яго назначэньню, як самалёта-агітатара. Унутры карабля будуць працаваць друкарня, радыё, кіно-лябараторыя. Салён будае багата аддзелан. Зварачаецца таксама вялікая ўвага на буфэт, спальныя каюты і інш. На выпадак пасадкі на самалёце павінны быць сродкі для перасоўваньня—мотацыкль, вэлёсыпэд і інш.

На борту «Максіма Горкага» будзе знаходзіцца 15-30 чалавек экіпажу і пасажыраў у залежнасьці ад дальнасьці палёту. У пасажырскім-жа варыянце «Максім Горкі» можа ўзяць на свой борт 70-75 чалавек, прадстаўшы палове з іх выгадныя лёжашэзы, а рэшце камфартабэльныя спальныя месцы.

Самалёт будзе добра вэнтыляваны. зімой апальваецца.

Асаблівая ўвага будзе зьвернута на зручнасьць абслугоўваньня матораў і усёй маторнай гаспадаркі, разьмешчанай у крыле. Для дапамозе гэтых трапаў можна будзе падыйсьці да дэталяў, якія знаходзяцца на маторы. У часе-ж палёту падыход да матораў ажыцьцяўляецца дзякуючы вялікім разьмерам крыльляў, якія дазваляюць чалавеку прайсьці ва ўвесь рост і дабрацца да кожнага матора, да ўсіх сыстэм яго жыўленьня (бэнзына-масла-вода-сыстэм). Гэтыя-ж вялікіх разьмераў крыльлі дазволяць ня толькі праверыць работу сыстэмы маторнага абсталяваньня, але і ў выпадку параўнальна нескладаных непаладак паправіць іх у палёце.

У сувязі з вялікай колькасьцю матораў на «Максіме Горкім», нагляд за ўсёй маторнай гаспадаркай будзе ўскладзен на спэцыяльнага інжынэра і мэханікаў. Усе прылады, якія кантралюць работу матораў, будуць сканцэнтраваны ў асобнай каюце з шыбамі наверсе, што дасьць магчымасьць з гэтага месца назіраць за работай матораў.

Сувязь-жа паміж пілётам, інжынэрам і мэханікам будзе ажыцьцяўляцца з дапамогай тэлефону і сьветлавой сыгналізацыі.

Тав. А. Н. ТУПАЛЁЎ—нам. нач. ЦАГІ, галоўны канструктар агіт-самалёту «М. ГОРКІ».

Гігант «Максім Горкі» будзе мець двухмэтравыя колы савецкага вырабу, з тормазамі, якія скароцяць прабег самалёта пры пасадцы. На шасі самалёта будзе ўстаноўлена масьляная амар тызацыя, якая забясьпечыць мяккую пасадку такой грандыёзнай машыны.

У будаўніцтве гіганта-самалёта прымае ўдзел уся наша краіна. Працоўныя Савецкага Саюзу ўжо сабралі на будаўніцтва самалёта звыш 3 мільёнаў рублёў.

Грамадзкасьць многіх краёў і рэспублік ня толькі выканала свае кантрольныя заданьні, але і высунула свае сустрэчныя лічбы, якія з посьпехам выконвае (Горкаўскі край, Зах. Сібір і інш.).

Работа па праектаваньні і пабудове «Максіма Горкага» ў ЦАГІ разгарнулася шырокім фронтам. Як вядома, грамадзкасьць нашага Саюзу горача ад гукнулася на пабудову паветранага вялікана.

Такі-ж гарачы водгук назіраем мы і сярод работнікаў ЦАГІ—непасрэдных будаўнікоў самалёта. Усе—пачынаючы ад наасобных работнікаў, груп, арганізацый — імкнуцца, спаборнічаючы, прыняць усямерны ўдзел у пабудове агітсамалёта. Работнікі ЦАГІ, якія ня могуць па сваёй спэцыяльнасьці прыняць непасрэдны ўдзел у праектаваньні і пабудове самалёта, працуюць на выходных днях або звышчасова і перадаюць сваю зарплату ў фонд «Максіма Горкага».

Са дня падпісаньня дагавору паміж Усесаюзным Камітэтам па пабудове «Максіма Горкага» і ЦАГІ прайшло два месяцы, а цэлы рад чарцяжоў (фюзеляжу, частак крыла) ужо спушчан на наш вопытны авіязавод. Некаторыя часткі самалёта ўжо знаходзяцца ў пабудове, некаторыя-ж элементы фузеляжа паступілі ужо на папярэднюю, частковую зборку.

Работа разгарнулася і на іншых заводах электрапрамысловасьці: прылад ных, маторных, якія прыступілі ўжо да праектаваньня і часткова да пабудовы неабходных для «Максіма Горкага» абсталяваньня і агрэгатаў.

Сваю гутарку Андрэй Мікалаевіч Тупалёў заканчыў словамі:

«Ад імя канструктарскага калектыву ЦАГІ запэўняю савецкую грамадзкасьць, што абавязацельства, прынятае намі, будзе выканана ў тэрмін і з гонарам. Першага мая 1934 г., у дзень міжнароднага сьвята працы, сацыялістычны гігант паветра імя ўлюбёнага пралетарскага пісьменьніка Аляксея Максімавіча Горкага будзе гор да рэяць над Чырвонай сталіцай»

Агітмарка, выпушчаная Усесаюзным камітэтам па пабудове агіт-самалёту «М. Горкі».

Кандыдаты на прэміяваньне па ўсебеларускім спаборніцтве за лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

Ніжэй друкуецца сьпіс кандыдатаў—перадавых ударнікаў: рабочых саўгасаў, брыгадзіраў калгасаў, калгасьнікаў і лепшых перадавых працоўных адпаасобнікаў.

Працяг гл. у № 149.

67. Аляксейчык — калгасьнік-ударнік калгасу імя Дзяржынскага, Рэчыцкага раёну.

68. Здаровец Рыгор—брыгадзір-ударнік, Брагінскага раёну.

69. Краўчанка — калгасьніца Брагінскага раёну.

70. Вутаёў — брыгадзір-ударнік калгасу імя Сталіна, Чэрыкаўскага раёну.

71. Гуралноў — калгасьнік-ударнік калгасу «Іскра», Чэрыкаўскага раёну.

72. Дзямідава — калгасьніца-ударніца калгасу імя Варапышава, Чэрыкаўскага раёну.

73. Пілішенка Гаўрыла — брыгадзір калгасу «Зьвязда», Мазырскага раёну.

74. Качан Прося — заг. сьвінаводчай фэрмы «Новыя Даманавічы», Мазырскага раёну.

75. Якуш Пётра — брыгадзір калгасу «Камінтэрн», Мазырскага раёну.

76. Ваброў Лявон — калгасьнік-ударнік калгасу імя Варапышава, Мазырскага раёну.

77. Якуш Аксіньня — калгасьніца-ударніца калгасу «Чырвоны араты», Мазырскага раёну.

78. Яруш — калгасьнік-ударнік, Ельскага раёну.

79. Сінгарчук — брыгадзір-ударнік Ельскага раёну.

80. Рамановіч Антон — ударнік калгасу імя Варапышава, Ельскага раёну.

81. Крушко Рыгор Васільеў — калгасьнік-ударнік калгасу «Прагрэс», Жытковіцкага раёну.

82. Макаровіч Аксіньня Сьцяпанава—калгасьніца-ударніца, Жытковіцкага раёну.

83. Канамацкі Сьцяпан Гаўрылаў — брыгадзір ударнік калгасу «Чырвоны Прымежнік», Жытковіцкага раёну.

84. Шапранская Хадосься — камунарка камуны «Індустрыялізацыя», Сеньненскага раёну.

85. Бароўскі—брыгадзір-ударнік калгасу імя 1 мая, Лагойскага раёну.

86. Сьмярнюк — брыгадзір-ударнік калгасу «Бальшавік», Лагойскага раёну.

87. Рыбчан—калгасьнік ударнік калгасу «Новачайка», Лагойскага раёну.

88. Рудзькевіч — калгасьнік-ударнік калгасу імя Будзённага, Лагойскага раёну.

89. Чаркова Кацярына — калгасьніца-ударніца калгасу імя Сталіна, Полацкага раёну.

90. Крупскі Павел — калгасьнік ударнік калгасу імя Молатава, Полацкага раёну.

91. Блепчык Пётра Пятроў — брыгадзір калгасу «Перамога», Смалявіцкага раёну.

92. Нарвін Рыгор — брыгадзір калгасу «16 партызьезд», Талачынскага раёну.

93. Чэробка Раман — брыгадзір, Асіпавіцкага раёну.

94. Татур Язэп Адамаў — брыгадзір Асіпавіцкага раёну.

95. Шлапак Сідар — брыгадзір калгасу «Чырвоны Араты», Камарынскага раёну.

96. Кавальчук Яўхім — брыгадзір калгасу «Чырвоны будаўнік», Камарынскага раёну.

97. Васілеўскі — брыгадзір калгасу імя Калініна, Вузьдзенскага раёну.

98. Бісюкоў Яўхім — брыгадзір калгасу «Чырвоны сьцяг», Вузьдзенскага раёну.

99. Махнач Кастусь — брыгадзір калгасу «Чырвоны